ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 48 (5003) 7 снежня 2018 г.

ISSN 0024-4686

16 +

Васіль Шырко: пра бездакорнасць слова
стар. 5

Праз восеньскія ўспаміны
стар. 7

Акадэмія з адчуваннем сям'і
стар. 12

«Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць!»

Фота Кастуся Дробава.

Выставачны праект «Маладая Беларусь», зладжаны Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы, дае новы погляд на дзейнасць Купалы і яго паплечнікаў стагоддзе таму. У той час маладыя разумелі: без трывалага падмурка мінуўшчыны немагчыма пабудаваць будучыню. Пра гэта сведчаць прадстаўленыя ў экспазіцыі творы Янкі Купалы гістарычнай тэматыкі, дакументы са збораў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і артэфакты з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Напрыканцы 1918 года, пасля некалькіх гадоў поўнага паэтычнага маўчання, Янка Купала зноў пачаў пісаць вершы… Актыўна, бадзёра, натхнёна і надзвычай плённа. У гэты час з'явілася легендарная «Спадчына», праграмны «Паязджане» і аптымістычны «У вырай», у творах песняра загучалі заклікі «На сход!», «Час!», звароты «Свайму народу». Купала нібыта адчуваў павевы часу, і веру ў светлую будучыню для беларусаў давалі спадзяванні на абвяшчэнне нашай краіны незалежнай рэспублікай.

Зрэшты, так і сталася. Спадзяванні маладых амбітных творцаў спраўдзіліся ўжо 1 студзеня 1919 года: Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі абвясціў Беларусь «вольнай незалежнай Сацыялістычнай Рэспублікай». Каб асабіста паведаміць знакавую навіну, Янку Купалу наведаў старшыня ўрада — Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны).

Намаганнямі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Усевалада Ігнатоўскага, Зміцера Жылуновіча паўсталі Беларускія дзяржаўныя бібліятэка, універсітэт, музей, архіў, тэатр, Інстытут беларускай культуры, быў вернуты з эвакуацыі педагагічны інстытут і закладзена сістэма адукацыі. З'явілася Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР у Маскве, сярод супрацоўнікаў якога быў паэт Уладзімір Дубоўка. Гэта быў напраўду знакавы час для гісторыі нашага народа, час станаўлення незалежнай дзяржавы.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 18048

Акцэнты тыдня:

краіна

Імідж. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка карыстаецца найбольшым даверам расіян сярод лідараў усіх краін СНД, сведчаць звесткі апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі. Вынікі сацыялагічнага даследавання былі прэзентаваныя на прэс-канферэнцыі ў Маскве, паведамляе БелТА. У рэйтынгу даверу Аляксандр Лукашэнка заняў першае месца. Паводле даследавання, гэты пункт гледжання падзяляюць 65 % рэспандэнтаў. Другое месца ў рэйтынгу заняў прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў, у падтрымку якога выказаліся 49 % расіян.

Стасункі. Дні культуры Казахстана выклікалі цікавасць грамадскасці. Афіцыйная цырымонія адбылася ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, паведамілі ў Міністэрстве культуры. Для ўдзелу ў культурных мерапрыемствах Мінск наведала афіцыйная дэлегацыя Казахстана на чале з саветнікам міністра культуры і спорту Баўыржанам Карагызулы. У апошнія гады культурныя кантакты паміж дзвюма краінамі развіваюцца дынамічна. Напрыканцы мінулага года ў Мінску быў падпісаны мемарандум аб паразуменні па культурным супрацоўніцтве паміж Міністэрствам культуры Беларусі і Міністэрствам культуры і спорту Казахстана.

Выстаўка. У Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва па ініцыятыве і пры арганізацыйнай падтрымцы Пасольства Беларусі ў Іспаніі адкрываецца сумесная выстаўка сучасных беларускай і іспанскай мастачак Алены Толабавай і Аіксы Партэра, чые творчыя праекты атрымалі назвы «*NEFT_Б*» і «*The Root*». Гэта працяг выстаўкі твораў беларускага і іспанскага мастацтва, якая з поспехам прайшла ў верасні-кастрычніку ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў у Мінску. Падзея стала магчымай дзякуючы праекту Пасольства Беларусі ў Іспаніі «Беларусь — Іспанія: крок насустрач», мэта якога — паглыбленне беларуска-іспанскіх эканамічных і міжрэгіянальных сувязяў, у тым ліку ў галіне культуры.

Юбілей. Вялікім канцэртам адзначыць сёння сваё 100-годдзе Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя Салярцінскага. Юбілейная ўрачыстасць пройдзе ў канцэртнай зале каледжа і збярэ цяперашніх выкладчыкаў, ветэранаў педагагічнай працы і многіх прыхільнікаў класічнай музыкі. На сцэне выступяць лаўрэаты міжнародных конкурсаў піяніст Андрэй Манулік, габаіст Сяргей Тумаркін, старшы выкладчык Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных, першая домра Расіі Кацярына Мачалава. Падчас урачыстасці прадстаўнікі Міністэрства культуры і Віцебскага аблвыканкама ўшануюць прадстаўнікоў каледжа і ветэранаў працы.

Памяць. «Напісаць і захаваць — як ратавалі рукапісныя часопісы» — такую назву атрымала новая старонка сумеснага праекта БелТА і Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны «Партызанскі летапіс». Асновай праекта стала ўнікальная калекцыя рукапісных партызанскіх часопісаў, якая захоўваецца ў музеі і мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі «1» міжнароднага значэння. Штотыдзень БелТА распавядае пра гэтыя хронікі і публікуе іх версіі, пераведзеныя ў лічбавы варыянт. Кожная з іх паказвае розныя бакі жыцця партызанскіх фарміраванняў. Публікаваць партызанскія часопісы, дапаўняючы ўнікальны тэкставы кантэнт архіўнымі фатаграфіямі агенцтва, мяркуецца да 3 ліпеня.

Напярэдадні. Падчас святкавання 127-га дня народзінаў Паэта ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча 9 снежня збяруцца тыя, хто адгарнуў старонку томіка з вершамі і адчуў покліч да творчасці. У праграме возьмуць удзел барды, паэты, музыкі, студэнты навучальных устаноў Мінска. Пасля ўскладання кветак да помніка Максіму Багдановічу (сквер каля опернага тэатра) у памяшканні музея адбудзецца святочны канцэрт «Багдановіч.*LIVE*».

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

З марай пра белы параход

Вынікі міжнароднага конкурсу ў гонар 90-годдзя Чынгіза Айтматава «З марай пра белы параход» будуць падведзены 11 снежня ў Доме літаратара. Заснавальнікі творчага спаборніцтва — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Пасольства Кыргызскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Саюз пісьменнікаў Беларусі.

— У конкурсе бралі ўдзел як прафесійныя аўтары, так і аматары. Імя Чынгіза Айтматава, яго глыбінная творчасць прываблівае шматлікіх прыхільнікаў мастацкага слова. Тэмы, якія ўзняў кыргызскі пісьменнік у сваіх аповесцях і раманах, маюць агульначалавечае значэнне, і сёння яго высокамастацкія творы хвалююць духоўнасцю, наводзяць на роздум пра жыццё чалавека, яго ўзаемадзеянне з прыродай і ўсім навакольным светам, — адзначыла адзін з арганізатараў конкурсу першы намеснік старшыні СПБ Беларусі Алена Стэльмах. — Чынгіз Айтматаў блізкі беларускаму чытачу. Да яго з асаблівай павагай ставяцца ў нашым творчым аб'яднанні.

У свой час старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец быў асабіста знаёмы з Чынгізам Айтматавым. Падчас сустрэч з чытачамі ён шчыра дзеліцца ўспамінамі аб знакавых сустрэчах з кыргызскім пісьменнікам і грамадскім дзеячам у Парыжы, на Ісык-Кулі…

Урачыстае падвядзенне вынікаў міжнароднага конкурсу літаральна напярэдадні дня нараджэння пісьменніка (12 снежня яму споўнілася б 90 гадоў) стане данінай памяці і павагі да знакамітага на ўвесь свет літаратара.

Марыя ЛІПЕНЬ

ВАЖКАСЦЬ СЛОЎ

Саюзу пісьменнікаў Расіі — 60

Віншаванне на адрас старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі Мікалая Іванова з нагоды 60-гадовага юбілею гэтай пісьменніцкай арганізацыі накіраваў Саюз пісьменнікаў Беларусі.

«Руская літаратура невыпадкова лічыцца адной з найвялікшых у свеце, — гаворыцца ў віншавальных радках. — Глыбока самабытная, яна ніколі не была нацыянальна абмежаванай. Найлепшыя рускія пісьменнікі адкрывалі для сябе найбагацейшы гістарычны вопыт іншых народаў і ў сваіх творах прадстаўлялі агульначалавечыя каштоўнасці. Прыемна ўсведамляць, што традыцыі рускай класічнай літаратуры актыўна працягваюць пісьменнікі Вашага Саюза. Слова пісьменніка важкае і мае вялікую значнасць».

— Для нас, пісьменнікаў Беларусі, вельмі важна адчуваць духоўнае адзінства з нашымі расійскімі калегамі-аднадумцамі, — падкрэсліў старшыня СПБ Мікалай Чаргінец. — Нас яднае агульная мэта — выхоўваць чалавека, які любіць чытаць, умее мысліць.

Беларускія літаратары жадаюць Саюзу пісьменнікаў Расіі квітнець, а сябрам-пісьменнікам — творчага запалу і жыццёвых поспехаў.

Марыя ЛІПЕНЬ

ПАМІЖ МІНСКАМ І ТЭГЕРАНАМ

Літаратурны мост, на думку кіраўніка Культурнага прадстаўніцтва Пасольства Абалсагема Махтарыяна, паспрыяе ўмацаванню кантактаў у галіне мастацкай літаратуры для таго, каб іранскія чытачы змаглі лепш пазнаёміцца з творчасцю як беларускіх класікаў, так і сучасных творцаў.

Саюз пісьменнікаў Беларусі мае плённыя стасункі з Пасольствам Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь. Абалсагем Махтарыян ужо не раз наведваў Дом літаратара з тым, каб зрабіць яшчэ больш грунтоўным літаратурны мост паміж Іранам і Беларуссю. Прынамсі, у нашай краіне можа быць больш прадстаўлена персідская літаратура: пераклады класікаў, творы сучасных аўтараў.

Падчас адной з сустрэч спадар Махтарыян зазначыў, што ў беларускай, рускай і персідскай літаратурах многа запазычанага. Яны ўзаемна цікавыя чытачам абедзвюх краін як асаблівасцямі ў нацыянальным менталітэце, так і роднасцю агульначалавечых каштоўнасцяў.

Мяркуецца, што падчас правядзення XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу будзе заключана пагадненне паміж іранскай установай «Шахр-э Кетаб» і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Паводле спадара Абалсагема Махтарыяна, такое пагадненне гэтая аўтарытэтная кніжная ўстанова Ірана ўжо заключыла з многімі міжнароднымі пісьменніцкімі арганізацыямі. Напрыклад, зусім нядаўна падобны дакумент быў падпісаны з Сербіяй. У лютым прадстаўнік «Шахр-э Кетаба» збіраецца наведаць у Беларусь.

Цяпер абодва бакі рыхтуюцца да гэтай падзеі, каб не толькі засведчыць факт літаратурнага сяброўства, але і прадставіць шэраг узаемна ажыццёўленых праектаў. Дзякуючы Культурнаму прадстаўніцтву Пасольства перыядычна ў інфармацыйнай прасторы Ірана з'яўляюцца паведамленні пра беларускіх пісьменнікаў, навіны з літаратурнага жыцця Беларусі. На літаратурным партале «Сугучча» Выдавецкага дома «Звязда» адзін з артыкулаў прысвечаны двум іранскім паэтам — Гейсару Амінпуру і Салману Гераці. Дарэчы, паэтэса Марыя Кобец зрабіла пераклад нізкі вершаў Гейсара Амінпура на беларускую мову.

У найбліжэйшых планах ірана-беларускага культурнага сяброўства — правядзенне мерапрыемства, прысвечанага іранскаму кінематографу, з абмеркаваннем сучасных праблем, якія хвалююць як сцэнарыстаў, так і літаратараў. Дзень памяці Фірдаусі будзе суправаджацца чытаннем урыўкаў з «Шахнамэ» і правядзеннем мастацкай выстаўкі па матывах гэтага твора.

— Асаблівую цікавасць для нас уяўляе і тэма 40-годдзя мастацкай літаратуры ў Іране пасля Ісламскай рэвалюцыі, — заўважыла першы намеснік старшыні СПБ Беларусі Алена Стэльмах. — Будзем рады адгукнуцца на запрашэнне іранскіх калег узяць удзел у міжнародным семінары «Культурны дыялог», які адбудзецца ў Ісламскай Рэспубліцы Іран у 2019 годзе.

Марыя ЛІПЕНЬ

Не толькі Купала

Новыя беларускія публікацыі ў Туркменістане

У туркменскай грамадска-палітычнай газеце «Несіл» (наклад — 53 049 экзэмпляраў) надрукаваны верш народнага песняра Беларусі Янкі Купалы ў перакладзе Чэмен Анабердыевай. У газеце «Ватан» — яе ж пераклад верша лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколы Мятліцкага.

У часопісе «Дунья эдэбіяты» («Сусветная літаратура») — у трэцім нумары (часопіс выходзіць адзін раз на два месяцы) за 2018 год — артыкул Алеся Карлюкевіча пра творчую дружбу народнага паэта Туркменістана Керыма Курбанняпесава (1929—1988) з Алесем Жуком, іншымі беларускімі пісьменнікамі, пра яго пераклады паэзіі народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі. Перакладчык — Гурбангельды Маметсачатаў. У часопісе «Гарагум» (адзінаццаты нумар за 2017 год) — нарыс А. Карлюкевіча пра беларускія старонкі ў біяграфіі вядомага туркменскага публіцыста Какалы Бердыева, які быў знаёмы з Алесем Адамовічам, у суаўтарстве з ім напісаў нарыс пра будаўніцтва Каракумскага канала. Дарэчы, у перакладзе на беларускую мову нарыс быў надрукаваны ў свой час у часопісе «Полымя», на рускай мове — у «Дружбе народов», на туркменскай — у часопісе «Савет эдэбіяты» (цяпер — «Гарагум»). Перакладчык нарыса пра Какалы Бердыева — Бягуль Анабаева. Між іншым, і Чэмен Анабердыева, і Бягуль Анабаева былі ў Беларусі, сустракаліся з калегамі — беларускімі пісьменнікамі. Творы і адной, і другой пісьменніц друкаваліся ў перакладзе на беларускую мову.

Сяргей ШЫЧКО

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

9 снежня *— на творчую сустрэчу з пісьменніцай, галоўным рэдактарам газеты «Воскресение» Аленай Міхаленкай у Мінскую духоўную акадэмію (12.00).*

10 снежня *— на музычна-літаратурную імпрэзу «Снегапад» з удзелам пісьменнікаў і студыі «Малінаўскія галасы» ў дзіцячую бібліятэку № 15 (16.00).*

11 снежня *— на творчую імпрэзу ў літаратурны клуб «Слова» пры публічнай бібліятэцы № 3 (14.00).*

11 снежня *— на сустрэчу з Міхасём Пазняковым у БДУІР (15.00).*

11 снежня *— на творчую імпрэзу з удзелам паэтаў у клуб «Парнас» пры публічнай бібліятэцы № 5 (16.00).*

11 снежня *— на сустрэчу з Алінай Легастаевай у межах праекта «Дыялогі пра сур'ёзнае» ў публічную бібліятэку № 5 (16.00).*

11 снежня *— на сустрэчу з Ганадам Чарказянам у літаратурна-музычную гасцёўню «Рамантыкі залатой пары» публічнай бібліятэкі № 11 (16.00).*

11 снежня *— на аўтарскі канцэрт кампазітара Віктара Лыскаўца «Музыка збірае сяброў» з удзелам Вольгі Шпакевіч у дзіцячую музычную школу № 1 (18.00).*

12 снежня *— у студыю юных літаратараў «Шабаноўскія званочкі» пры дзіцячай бібліятэцы № 3 (11.00).*

12 снежня *— на прэзентацыю кнігі Валянціны Паліканінай «Прызнанне ў каханні» ў Цэнтральную бібліятэку імя Янкі Купалы (17.00).*

14 снежня *— на сустрэчу з Наталляй Саветнай у студыю мастацкага чытання «Вобраз» пры СШ № 168 (13.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

8 снежня *— на літаратурна-паэтычнае свята «Лунінецкая восень» з удзелам пісьменнікаў у школу в. Лунін (10.00).*

12 снежня *— на прэзентацыю анталогіі пісьменнікаў абласнога аддзялення СПБ у Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна (14.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

13 снежня *— на літаратурную сустрэчу па старонках кнігі «Снежныя дзівацтвы прыроды» дзіцячых пісьменнікаў Галіны і Сяргея Трафімавых у СШ № 17 г. Оршы (12.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

11 снежня *— на сустрэчу Людмілы Кебіч з бібліятэкарамі вобласці ў Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці (11.00).*

12 снежня *— на літаратурную імпрэзу «Краю мой родны...» з удзелам Людмілы Кебіч, Ганны Скаржынскай-Савіцкай, Вікторыі Смолкі і іншых пісьменнікаў у Гродзенскі дзяржаўны Дом-музей Максіма Багдановіча (16.00).*

13 снежня *— на сустрэчу з Дзмітрыем Радзівончыкам «Увага: паэзія!» у інтэрнат Гродзенскага медыцынскага дзяржаўнага каледжа (19.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

12 снежня *— на вечар-партрэт «Партызан і рэдактар» з нагоды 95-годдзя з дня нараджэння заслужанага работніка культуры Беларусі Георгія Барысава з удзелам Міколы Леўчанкі (у межах падрыхтоўкі да 75-годдзя вызвалення Быхаўшчыны і ўсёй Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў) у Быхаўскую цэнтральную раённую бібліятэку (14.00).*

З перамогай!

Творчасць без перашкод

Гран-пры нашых парадэльфійцаў

На II Міжнародных Парадэльфійскіх гульнях па колькасці атрыманых узнагарод Беларусь заняла 2-е месца, саступіўшы Кітаю. Гран-пры атрымаў беларускі народны мужчынскі вакальны гурт «Хорус», які 13 гадоў дзейнічае на прадпрыемстве «Элект» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. Квартэт выконваў два нумары: «Белая Русь ты мая» «Песняроў» і папуры, складзенае з песень савецкіх кампазітараў. Акрамя шматлікіх перамог у намінацыях, беларусы адзначыліся як «Самая пазітыўная і дружная каманда».

Удзел нашай дэлегацыі падтрымала Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Сёлетнія II Міжнародныя Парадэльфійскія гульні праходзілі ў Іжэўску (Удмурція). Гэта маштабны інклюзіўны творчы конкурс для людзей з інваліднасцю. На працягу тыдня больш як 1,5 тысячы ўдзельнікаў з 22 краін выступалі ў 29 намінацыях і прадстаўлялі 8 відаў мастацтва: музычнае, выяўленчае, аўдыявізуальнае, тэатральнае, харэаграфічнае, цыркавое, літаратуру і жэставую песню.

— Яшчэ ў 2016 годзе наша краіна ратыфікавала Канвенцыю ААН аб правах людзей з інваліднасцю. Міністэрства культуры, як і некаторыя іншыя дзяржаўныя органы, з'яўляецца сувыканаўцам Нацыянальнага плана дзеянняў па рэалізацыі гэтай канвенцыі, — расказала Наталля Задзяркоўская, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення культуры і аналітычнай работы — начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Галоўнае для дзяржавы ў гэтым кірунку — арганізацыя такога тыпу пляцовак, дзе творцы маглі б працаваць без перашкод. Сярод важкіх новаўвядзенняў у нашай краіне — з'яўленне тактыльных скульптур і карцін, аўдыягідаў для інвалідаў па зроку і відэагідаў для людзей з праблемамі слыху ў Нацыянальным мастацкім музеі. Арганізаваны ўнікальны для Беларусі конкурс «Маленькая міс і маленькі містар *Deaf*» сярод дзяцей з парушэннем слыху да 12 гадоў на базе філіяла «Цэнтр інклюзіўнай культуры» ДУ «Гарадскі цэнтр культуры г. Гомеля». Дзейнічае таксама Народны тэатр мімікі і жэста «Інклюзіён», са спектаклем якога плануюцца гастролі па Беларусі. Створаны праект «Адукацыя без перашкод» у межах больш буйнога праекта «Вучыцца, каб дзейнічаць», які дазволіў людзям з абмежаванымі магчымасцямі атрымаць новую прафесію. Сярод такіх значных праектаў — «Свет без меж» мастацкага клуба-студыі «Палітра радасці», які ўдзельнічаў у выстаўцы ў Маскве.

— Інваліды сутыкаюцца са шматлікімі праблемамі ў грамадстве, — адзначыла Людміла Калмыкава, старшыня праўлення Мінскай гарадской арганізацыі «Беларускае таварыства інвалідаў». — Для іх вырашэння неабходна змяняць у свядомасці стаўленне да інвалідаў. І лягчэй за ўсё гэтага дасягнуць, менавіта дэманструючы дасягненні ў галіне культуры.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Фэст

ЁСЦЬ ЛЮБОЎ...

Аматарскія тэатры: філасофія жыцця

Фота Алены Громавай.

Дзмітрый Шуманін атрымлівае Гран-пры.

Абласны фестываль у Беразіно «Бярэзінская рампа» адзінаццаты раз сустракаў народныя аматарскія тэатры Міншчыны. Сем творчых калектываў прадставілі свае спектаклі на суд журы і мясцовага гледача і пазмагаліся за Гран-пры. Жыхары горада нават на ранішнія спектаклі прыходзілі з вялікай ахвотай, але на прадстаўленне гаспадароў сцэны, якія адкрывалі фестываль, квіткоў не было ўжо за тыдзень…

Рэжысёр Мікалай Пытляк на фестывалі прадставіў камедыю Карла Гальдоні «Карчмарка». Па яго словах, п'есу ён стараўся максімальна адаптаваць пад магчымасці калектыву і пад наяўныя дэкарацыі. Акцёры, звычайныя бярэзінцы, трымаліся на высокім узроўні. Мікалай Пытляк, які арганізаваў фестываль, адзначыў, што тэатральныя калектывы ўжо ведаюць і рыхтуюцца да яго: «Бярэзінская рампа» праводзіцца з 1997 года. Узровень творчых работ адсочвала загадзя камісія з абласнога Цэнтра народнай творчасці.

Напрыклад, тэатр Палаца культуры «БелАЗ-холдынг» выступіў з пастаноўкай паводле драмы Аляксандра Галіча «Матроская цішыня». Рэжысёр Наталля Радзівонава падабрала добры творчы склад артыстаў. Жодзінцы ўжо пяты раз прыязджаюць на «Бярэзінскую рампу» і трымаюцца ў ліку фаварытаў: акцёраў ведаюць, на спектаклі прыходзяць. Гэта лёгка зразумець, калі ўлічыць, што тэатр пры прадпрыемстве БезАЗ ставіць у сярэднім каля 5 пастановак у год.

Заслужаны аматарскі калектыў рэспублікі нясвіжскі тэатр імя Уршулі Радзівіл выступіў з драмай Аляксея Дударава «Чорная панна Нясвіжа», якая ў інтэрпрэтацыі рэжысёра Яўгена Валабоева атрымала назву «Бог ёсць любоў». Менавіта гэтая фраза падштурхнула Яўгена Валабоева змяніць звыклы сюжэт: тут усё канчаецца добра.

Трупа з Вілейкі прадставіла спектакль па Міхаіле Булгакаве «Зойкіна кватэра» рэжысёра Вадзіма Шырочына — пра імкненне людзей да карысталюбства. Праблема выбару гучыць у пастаноўцы Ігара Куніцкага «Клаўдзій», якую паказаў заслужаны аматарскі калектыў Беларусі драматычны тэатр «Відарыс»: далучыцца да свету інтрыг або захаваць узнёслыя пачуцці. Слуцкі народны тэатр «Папараць кветка» прадставіў сюррэалістычную камедыю «Міма дажджоў», якую напісаў і паставіў рэжысёр Дзмітрый Шуманін. Ён жа выканаў у пастаноўцы адну з галоўных роляў. У камедыі чалавечыя адносіны былі перанесены на ўзаемадзеянне прыродных стыхій: грыбны дождж закаханы ў сонца, якое ўпадабала свежы вецер, дождж навальнічны хацеў бясконца праліваць з нябёсаў, а восень памяняла сваё аблічча са змрочнага на бліскучае…

Звярнуцца ўнутр сябе прапанавала рэжысёр Ала Кананові, уключыўшы вершы Амара Хаяма ў пастаноўку «Спатканне па серадах, або Сцэны з сямейнага жыцця» (паводле В. Краснагорава) Маладзечанскага народнага тэатра «Адлюстраванне».

Па-за конкурсам — народны маладзёжны тэатр «Штурх» Палаца культуры «БелАЗ-холдынг» прадставіў камедыю Рэя Куні «Чыста сямейная справа», увасобленую рэжысёрам Святланай Мытнік.

Па волі журы Гран-пры 11-га фестывалю народных тэатраў «Бярэзінская рампа» аддадзена пастаноўцы «Міма дажджоў» слуцкага рэжысёра Дзмітрыя Шуманіна. Лепшую мужчынскую ролю сыграў Валерый Чычулін з Вілейкі, ён жа Аметыстаў у спектаклі «Зойкіна кватэра», а лепшую жаночую — Марына Сасункевіч з Нясвіжа, або Барбара Радзівіл.

— Калектывы ацэньваліся па крытэрыях таленту і стаўлення да працы над творам, — патлумачыў старшыня журы Уладзімір Мішчанчук. — Пераможца конкурсу Дзмітрый Шуманін, на маю думку, — вялікі талент, які яшчэ праявіць сябе, і не толькі ў Слуцку, але і ў маштабах рэспублікі. У фестываль жа ён унёс свежы подых, што трэба захаваць.

Павел САЛАЎЁЎ

Люстэрка тыдня:

свет

Гэтымі днямі ў шэрагу буйных гарадоў Францыі — Парыжы, Бардо, Нансі, Ніцы, Тулузе ды іншых — праходзіць паказ балета «Ганна Карэніна» на музыку Пятра Чайкоўскага ў пастаноўцы славутага Тэатра балета Барыса Эйфмана, паведамілі ў Пасольстве Беларусі ў Францыі. Галоўныя партыі выконваюць у тым ліку выпускнікі Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа Любоў Андрэева і Ігар Субоцін. З 28 лістапада па 2 снежня з вялікім поспехам балетная пастаноўка была прадстаўлена на адной з самых вялікіх пляцовак Парыжа — Палацы Кангрэсаў. 2 снежня на спектаклі прысутнічаў Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка, які адзначыў, што парыжская публіка вітала выступленне артыстаў балета стоячы.

Жыхары расійскага Далёкага Усходу абралі назвы для галоўных аэрапортаў гэтай часткі краіны, паведамляе ТАСС. Як вынікае з табліцы, апублікаванай на сайце праекта «Вялікія імёны Расіі», паветраныя гавані атрымаюць імёны мараплаўцаў і даследчыкаў рэгіёна Вітуса Берынга, Генадзя Нявельскага і Мікалая Мураўёва-Амурскага, навукоўца Уладзіміра Арсеньева, пісьменнікаў Антона Чэхава, Юрыя Рытхэу і Платона Ойунскага, а таксама паэта і артыста Уладзіміра Высоцкага. За прысваенне 47 аэрапортам краіны імёнаў выбітных асоб, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё гэтай зямлі, расіяне галасавалі на працягу двух месяцаў.

Зорка Галівуда Аль Пачына выканае галоўную ролю ў экранізацыі п'есы Уільяма Шэкспіра «Кароль Лір», паведамляе *The Guardian*. Рэжысёрам будучай карціны выступіць Майкл Рэдфард. Ён ужо працаваў разам з акцёрам у 2004 годзе над фільмам па п'есе Шэкспіра «Венецыянскі купец», дзе Аль Пачына сыграў ролю Шэйлака. У інтэрв'ю выданню Рэдфард адзначыў, што выканаць ролю Ліра імкнуцца ўсе акцёры. Аль Пачына марыў пра гэта на працягу некалькіх гадоў. Пачатак здымак прызначаны на восень. Яны будуць праходзіць у Вялікабрытаніі. Дата прэм'еры пакуль не называецца.

Кампанія *Netflix* плануе зняць анімацыйны серыял па матывах твораў брытанскага пісьменніка Роальда Даля, які атрымаў вядомасць дзякуючы кнігам для дзяцей з доляй чорнага гумару. Серыял будзе ствараццa ў супрацоўніцтве з *The Roald Dahl Story Company*. *Netflix* мяркуе запрасіць лепшых сцэнарыстаў і стваральнікаў візуальных эфектаў. Здымкі плануецца пачаць у наступным годзе. Кампанія паабяцала захаваць дух твораў Даля.

Сямігадовы хлопчык Раян узначаліў рэйтынг *YouTube*-блогераў з самым высокім заробкам за 2018 год. Яго гадавы прыбытак склаў $22 млн, паведаміла БелТА са спасылкай на часопіс *Forbes*. Раян з дапамогай бацькоў здымае для свайго *YouTube*-канала *Ryan Toys Review* ролікі-агляды новых цацак. Больш за 17 млн карыстальнікаў падпісаны на канал хлопчыка, яго відэа паглядзелі 26 млрд разоў. Прозвішча і месца жыхарства хлопчыка не выдаюцца.

Куртка Майкла Джэксана прададзена на аўкцыёне ў Нью-Ёрку за 298 тысяч долараў, паведамілі ў аўкцыённым доме *Julien's Auctions*. Гаворка ідзе пра куртку з чорнымі папружкамі і срэбнымі зашпількамі-маланкамі, якая каштавала каля 80—100 тысяч долараў. Чорная куртка была на Джэксане падчас яго першага сольнага тура *Bad Tour* (доўжыўся з верасня 1897 па студзень 1989 года). На куртцы ёсць аўтограф Джэксана.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

ЛіМ КАЛЯНДАР

9 снежня — 120 гадоў з дня нараджэння Валянціны Валчанецкай (1898—1980), спявачкі, народнай артысткі БССР.

9 снежня — 105 гадоў з дня нараджэння Ісідара (Ізраіля) Баса (1913—?), крытыка, літаратуразнаўца.

9 снежня — 85 гадоў з дня нараджэння Георгія Дубава (1933—1995), народнага артыста БССР.

10 снежня — 90 гадоў з дня нараджэння Мікалая Васілеўскага (1928—1989), мовазнаўца.

11 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Тамары Бушко (1918—1981), тэатральнага крытыка.

11 снежня 60 гадоў святкуе Наталля Дамянікава, народны майстар саломапляцення.

12 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Кастуся Кірэенкі (Канстанціна Ціханавіча) (1918—1988), паэта, празаіка, публіцыста, перакладчыка, заслужанага дзеяча культуры БССР.

12 снежня 80 гадоў спаўняецца Мікалаю Цурыкаву, мастаку.

13 снежня — 115 гадоў з дня нараджэння Надзеі Варвановіч (1903—1985), мастака.

13 снежня 70 гадоў адзначае Сяргей Шафрановіч, мастак.

14 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Барыса Нікольскага (1918—2001), спевака, заслужанага артыста БССР.

14 снежня 60-годдзе адзначае Пётр Русак, мастак.

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2019 г.

«ЛіМ»	1 месяц	падпісны індэкс
Для індывідуальных падпісчыкаў	**6 р. 10 к.**	63856
Ведамасная падпіска	**16 р. 70 к.**	638562
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў	**4 р. 30 к.**	63815
Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі	**12 р. 70 к.**	63880

Землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

ПРАЗРЫСТАЯ ВЕРА ФАРБАЎ АЛЯКСАНДРА КАНАВАЛАВА

Наша дзявятая полацкая школа цяпер зусім нешматлікая па колькасці вучняў, базавая, бо побач, у новым мікрараёне, адна з найбольш сучасных сярэдніх школ горада — менавіта туды бацькі імкнуцца аддаваць сваіх дзяцей. А ў мой час гэта была паўнацэнная навучальная ўстанова, дзе займаліся дзеці з нашай гарадской ускраіны і нават з бліжэйшых вёсак Пагіршчыны і Чарнешчыны. У мае вучнёўскія гады тут станавіліся на крыло будучы дырэктар гісторыка-культурнага запаведніка Мікалай Ільніцкі, загадчыца цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы Полацка Таццяна Савельева, вядомы літаратар і навуковец Пятро Васючэнка…

Разам са мной у паралельным класе — будучыя сябры Саша Канавалаў і Валодзя Варпаховіч. Потым мы сталі аднакласнікамі і доўгія гады былі разам. Саша і Валодзя займаліся маляваннем, а сёння ўжо Аляксандр Канавалаў — вядомы мастак не толькі ў Беларусі. Гэта яму ў свой час я прысвяціў такія радкі:

Гэтыя птушкі , якіх не бывае,
Гэтыя кветкі, што бачыць адзін…
Дух адзіноты пакутна лунае
На вернісажы самотных карцін.

Зрэшты, так склалася, што многія мае вершы, прысвечаныя выяўленчаму мастацтву, былі навеяны сяброўствам і карцінамі маіх сучаснікаў і сяброў Аляксандра Канавалава, Віктара Стасевіча, Сяргея Цімохава.

Сёння творы Аляксандра Канавалава знаходзяцца ў фондах Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, Музея Марка Шагала ў Віцебску, музеяў Расійскай Федэрацыі, у калекцыі галерэі «*Du Beau*» (Борнхайм, Германія), а таксама ў прыватных калекцыях Беларусі і за мяжой.

Гэта цяпер. А да гэтага быў даволі доўгі і няпросты час станаўлення, вызначэння сваёй творчай манеры. Канавалаў паспеў закончыць у Віцебску мастацка-графічны факультэт мясцовага педінстытута, папрацаваць у віцебскіх мастацка-вытворчых майстэрнях, мастаком-рэстаўратарам Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка, павыкладаць у Полацкай дзіцячай мастацкай школе.

У 1990 годзе ён разам з Сяргеем Цімохавым стаў адным з заснавальнікаў прыватнай карціннай галерэі «Рыса», да якой было таксама творчае аб'яднанне сяброў, куды разам з ім уваходзілі вядомыя цяпер мастакі Алег Ладзісаў і Васіль Васільеў.

У той час галерэю «Рыса» падтрымаў былы дырэктар Полацкага камбіната будаўнічых матэрыялаў Уладзімір Цялежнікаў. Мастакі не толькі займелі выдатныя творчыя майстэрні, але і сваю карцінную галерэю, на выстаўкі ў якой адмыслова прыязджалі творцы і аматары мастацтва з Віцебска, Мінска, з усёй Беларусі і нават з-за мяжы. А потым да мастака Аляксандра Канавалава прыйшоў час паглыблення ва ўласную творчасць, пошукі свайго адметнага стылю.

Пра яго творчую манеру пісалі мастацтвазнаўцы, журналісты, сябры па творчым цэху Л. Фількенштэйн, В. Богуш, П. Велікжанец, А. Козік, Л. Малашэня, А. Карнейка і іншыя. Вось некаторыя водгукі пра яго сённяшнія здабыткі: «Аляксандр Канавалаў — бадай адзін з самых адметных мастакоў Полацка, калі нават казаць пра ўсё мінулае стагоддзе. Ягоны нетрадыцыйны, загадкавы жывапіс даўно стаўся з'явай усяго беларускага выяўленчага мастацтва…»

«У сваёй творчасці мастак рухаецца да карціны, якая не столькі "адлюстроўвае", малюючы знешняе, колькі выказвае ўнутранае. Ён адзначае для сябе, што "мастацтва — гэта не проста гульня, гэта тое няўлоўнае падсвядомае, спазнаўшы якое і даверыўшыся якому, можна наблізіцца да ілюзорнай сутнасці светабудовы"».

У маёй мінскай кватэры ёсць не адна работа Канавалава. Іх таемнае дзіўнае святло, як я таксама ў свой час засведчыў у адным з вершаў, мне свеціць напамінам пра нашы юначыя гады, пра родны горад, пра глыбокія і светлыя пачуцці.

Невядомы тэкст Купалы

З напісанага Янкам Купалам сёння — 10 кніг дзевяцітомнага выдання, што пабачыла свет на працягу 1995—2003 гг. Але слушна адзначаў адзін з рэдактараў гэтага шматтомніка, аўтарытэтны архівіст Віталь Скалабан: звычайная практыка, калі поўныя зборы з цягам часу дапаўняюцца новымі адкрыццямі і знаходкамі.

Мяркую, што такім каштоўным дадаткам станецца рукапісны тэкст Песняра, які мне пашчасціла знайсці падчас архіўных даследаванняў мінскай Лошыцы — унікальнага сядзібна-паркавага комплексу і знакамітага сучаснага турыстычнага аб'екта сталіцы.

Гісторыяй Лошыцкай сядзібы займаюся з перапынкамі ўжо амаль чвэрць стагоддзя. Яе лёс звязаны са шматлікімі імёнамі славутых людзей. Гэта прадстаўнікі шляхетных родаў Друцкіх-Горскіх, Прушынскіх, сусветна вядомыя навукоўцы Мікалай Вавілаў, Аляксей і Эма Сюбаравы, Анатоль Валузнёў, класік беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і інш.

На працягу даволі доўгага часу, з 1920-х да сярэдзіны 1980-х гг., у Лошыцкай сядзібе працавалі навукоўцы-селекцыянеры. Варта адзначыць, што Лошыца стала тым месцам, дзе пачалася беларуская навуковая селекцыя. На пачатку 1920-х тут дзейнічала вучэбная ферма Беларускага дзяржаўнага інстытута сельскай гаспадаркі, якую ўзначальваў Яраслаў Ясінскі. Праз яго асобу я і адшукаў у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь невядомы тэкст нашага народнага паэта.

Але ўсё па парадку. Яраслаў Ясінскі мяне асабліва зацікавіў сёлета ў ходзе мэтанакіраваных пошукаў доказаў знішчэння бальшавікамі Лошыцкай алтарыі — каталіцкай капліцы Нараджэння Панны Марыі (1787). Ад гэтага помніка позняга беларускага барока засталася толькі напаўразбураная касцельная сцяна, што сёння маўкліва стаіць збоч цэнтральнай алеі Лошыцкага парку.

Як сведчаць аповеды некаторых старажылаў колішняй вёскі Лошыца, алтарыю ўзарвалі ў 1930-х, пад покрывам ночы, а людзям патлумачылі, што войскі Чырвонай Арміі праводзілі спецвучэнні і памылкова падарвалі не той аб'ект. Заўважу, дакументальных пацвярджэнняў гэтага варварства пакуль не знайшоў. Затое натрапіў на цікавыя матэрыялы пра «абстрэл» Лошыцы ў 1924 г. артылерыяй 7-й кавалерыйскай Самарскай дывізіі (са жніўня 1924 г. — імя Англійскага пралетарыяту), якая ў 1921—1940 гг. дыслацыравалася пад Мінскам.

1 красавіка 1924 г. кіраўнік вучэбнай фермы «Лошыца» Яраслаў Ясінскі зусім не з жартоўных меркаванняў (улічваючы дату) пісаў рэктару згаданага інстытута прафесару Аляксандру Кірсанаву (1880—1941) наступнае: «Доношу, что 31 марта с/г артиллерия 7-й Кав. Дивизии устроила, несмотря на мой протест, стрельбище на поле фермы вблизи усадьбы. Во время стрельбы снаряды рвались в районе самой усадьбы и только благодаря счастливому случаю и тому обстоятельству, что были прекращены все работы и все люди сидели по квартирам, дело обошлось благополучно. Приложение: один из многих подобранных в усадьбе осколков от снарядов».

Працаўнікі фермы яшчэ і раней былі, так бы мовіць, не ў захапленні ад чырвонаармейцаў дывізіі, у прыватнасці яе 40-га кавалерыйскага палка. Доказ таму — шматлікія лісты Ясінскага камандаванню гэтага палка. Напрыклад, адзін з іх, ад 24 снежня 1923 г., пачынаўся так: «Несмотря на неоднократные обещания прекратить мародерства красноармейцев частей полка, расположенных на ферме, таковые продолжаются, и если постой продолжится в течение всей зимы, то ферма будет иметь вид, как после нашествия неприятеля».

Пакуль застаецца нявысветленым, хто быў камандзірам 40-га кавалерыйскага палка ў час згаданых падзей. Але дзеля цікавасці заўважым, што 39-м кавалерыйскім палком 7-й кавалерыйскай Самарскай дывізіі ў гэты час камандаваў Георгій Жукаў (1896—1974) — будучы маршал і знакаміты савецкі палкаводзец.

А хто такі Яраслаў Ясінскі?

Аказваецца, гэта той самы Ясінскі, якога Я. Купала згадваў добрым словам у сваім лісце ад 20 сакавіка 1920 г. у рэдакцыю газеты «Беларусь». Вось вытрымкі з таго ліста, змешчанага ў поўным дзевяцітомным зборы твораў Я. Купалы: «Вельмі паважаны Пане Рэдактар! Не адкажыце надрукаваць у Вашай газеце гэтых колькі слоў. 9 студзеня г.г. я цяжка захварэў і 13 студзеня я ўжо быў у Земскай бальніцы, дзе пралежыў да 20 сакавіка. У часе гэтай маёй хваробы шмат асоб аказалі мне па-праўдзе братнюю помач і апеку. ...Не магу таксама не ўспомніць добрым словам д-ра Малькевіча, які на кватэры аказаў мне першую помач, а так жа прафесара Іваноўскага, Б. Тарашкевіча, Ясінскага, Ерохава і інш., што сваімі рукамі на насілках занеслі мяне з кватэры аж у бальніцу».

Ідэнтыфікаваць Ясінскага мне дапамаглі адшуканыя біяграфічныя звесткі і асабістая заява ад 6 жніўня 1920 г. у Мінскі губернскі зямельны аддзел з просьбай «предоставить работу по специальности техника-механика». Апошні дакумент і з'яўляецца каштоўнай знаходкай, бо на ім уласнаручныя рукапісныя рэкамендацыі, якія далі просьбіту Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч (1883—1937) і Янка Купала.

Будучы акадэмік С. Некрашэвіч, ініцыятар стварэння і першы старшыня Інстытута беларускай культуры, а тады загадчык літаратурна-выдавецкага аддзела Народнага камісарыята асветы (Наркамасветы), напісаў: «Тов. Ясинский лично мне известен как в высшей степени честный и серьезный работник». А беларускі пясняр падкрэсліў наступнае: «Тав. Ясінскага знаю як самага акуратнага і сумленнага працаўніка, якому можна даверыць самую адказную працу».

Адкуль маглі ведаць Ясінскага С. Некрашэвіч і Я. Купала, робіцца зразумелым з анкеты першага, датаванай 1920 г. Яе сціслыя запісы паведамляюць, што Яраслаў Уладзіслававіч Ясінскі нарадзіўся 11 лютага 1875 г. у Барысаўскім павеце Мінскай губерні, меў «сярэдне-тэхнічную адукацыю» і «дваццацігадовы практычны стаж», быў жанаты і меў дваіх дзяцей, валодаў рускай, беларускай і польскай мовамі, з'яўляўся членам камісіі аддзела забеспячэння Наркамасветы. А ў Наркамасветы ў 1920 г. якраз і працавалі С. Некрашэвіч і Я. Купала.

У інтэрнэт-крыніцах, прысвечаных ахвярам сталінскіх рэпрэсій, змешчана інфармацыя пра Яраслава Уладзіслававіча Ясінскага, 1881 г. н. (хутар Валянцінава, Плешчаніцкая воласць, Барысаўскі павет, Мінская губ.) як сакратара Беларускага НДІ сельскай гаспадаркі, асуджанага ў 1931 г. за антысавецкую агітацыю на тры гады высылкі, і як жыхара саўгаса «Красный колос» Ліпецкага раёна, які ў 1930-х гг. быў рэпрэсаваны і расстраляны. Таксама адзначаецца, што 19 мая 1989 г. ён быў рэабілітаваны Пракуратурай БССР. Хутчэй за ўсё (улічваючы недакладнасць у даце нараджэння), гэта і ёсць былы кіраўнік вучэбнай фермы «Лошыца» Яраслаў Ясінскі, які быў пасля першага арышту высланы ў Расію, а там пазней паўторна арыштаваны і расстраляны.

На вялікі жаль, звесткі пра Я. Ясінскага пакуль абмяжоўваюцца толькі вышэйпададзенай інфармацыяй. Спадзяюся, што неўзабаве архівы адкрыюць і іншыя цікавыя падрабязнасці яго стасункаў з Янкам Купалам.

P. S. Фотакопія поўнага тэксту заявы Я. Ясінскага надрукавана ў кнізе Ю. Кур'яновіча «Старасвецкая Лошыца», што неўзабаве пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь». У кнізе таксама ўпершыню змешчаны шэраг іншых цікавых архіўных дакументаў.

Юры КУР'ЯНОВІЧ

Лошыцкая сядзіба ў даваенны час.

ВАСІЛЬ ШЫРКО: «ГОДНАСЦЬ ПАВІННА БЫЦЬ!»

Сённяшні мой суразмоўца — лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Проза». Аўтар вострасюжэтных аповесцяў, якія спалучаюць глыбокі псіхалагізм і дзеянне, што трымае ў напрузе з першай да апошняй старонкі; унікальных літаратуразнаўчых нарысаў пра пісьменнікаў Паўлюка Труса, Алеся Махнача, Антона Бялевіча, Тодара Кляшторнага, Ілью Гурскага, Цішку Гартнага, Алеся Якімовіча, Пятра Глебку. Ураджэнец вескі Чурылава, што на Уздзеншчыне, якая ўзгадавала шмат самабытных талентаў. Пад вокладкай выдання «Нязваны госць» (Мастацкая літаратура, 2017) пабачылі свет творы розных гадоў, разнастайнай тэматыкі: ад ваеннай да сучаснай. У асобе Васіля Шырко спалучыўся выдатны журналіст і цікавы, адметны пісьменнік. А пачынаў ён, вясковы хлапчук, як і многія творцы, з паэзіі.

— Ці помніце, Васіль Аляксандравіч, пра што быў ваш першы верш?

— Яшчэ б не помніць! Ён мне 4 гады жыцця сапсаваў! У нашым калгасе быў сад. Аднойчы ўвосень аграномша купіла для яго дрэвы, але замест таго, каб правільна ўладкаваць да моманту пасадкі, проста кінула ў хлеў. Карэнне зямлёй не прысыпала — яны і замёрзлі за зіму. Ну я і напісаў: «Што за бедны-бедны сад: / стаяць дрэвы рад у рад / і дайшло аж да таго, / што лісточка ні аднаго… / У дрэнным ён наглядзе, / вусені бегаюць па садзе... / Аграном была няўдалай… / І пакуль прайшла зіма, / сад змарозіла яна. / Можа, новы старшыня / скажа нам, у чым віна…»

Верш палажыў у кіпу на стол. А да бацькі прыйшоў сусед. Убачыў верш… А тады, трэба заўважыць, вяскоўцы часта выступалі з самадзейнасцю. І вось ён выходзіць на сцэну і гаворыць: «Верш вучня 4 класа Васіля Шырко…» Поўны клуб народу. У першым радзе — аграномша і яе муж, настаўнік нямецкай мовы… Яны бялелі і чарнелі, пакуль ён чытаў той верш… Настаўнік помсціў мне чатыры гады… Я авалодаў нямецкай мовай лепш за яго… Пазней неяк сустрэліся ў лазні, ён і кажа мне: «Даруй!» Я адказаў: «Бог даруе! Каб вы мяне так не ганялі, я і не вывучыў бы добра». Дарэчы, я напісаў пра гэта апавяданне.

— Вашы паэтычныя публікацыі станоўча адзначалі крытыкі, па першых надрукаваных творах было ясна: у літаратуру прыйшоў талент. Чаму вы ў хуткім часе кінулі пісаць вершы?

— Падчас вучобы на філфаку наведваў літаб'яднанне Алега Лойкі. Нас было каля 30 паэтаў і толькі 1 празаік. Я зразумеў: столькі паэтаў нікому не патрэбна. Трапіўшы ў Маскву, канчаткова ўсвядоміў: трэба забыць пра паэзію. Брацца за прозу і публіцыстыку. Гэта перакананне падмацавалася някепскімі ганарарамі...

— Як апынуліся ў Маскве?

— Гісторыя не зусім прыемная. Вырваўшыся з вёскі на волю з-пад пільнага вока бацькі (а ў школе былі таксама строгія настаўнікі — рот не давалі раскрыць), адчуў волю (быў баявы)... Ну, і пабіліся неяк у інтэрнаце. І хоць у той бойцы я не быў вінаваты, мяне адхілілі ад абароны дыплома і дзяржіспыту. І замест таго, каб пайсці потым у армію афіцэрам (а я скончыў ваенную кафедру, зборы прайшоў), трапіў у будаўнічы атрад шарагоўцам. Размеркавалі ў Маскву. Некалькі месяцаў сядзеў у яме, у Хімках, — траншэі капалі. А тады на будоўлю прыходзіла газета Міністэрства абароны. Я прачытаў яе ў вольную хвілінку і зразумеў, што і сам магу напісаць лепш (была добрая студэнцкая практыка: друкаваўся і ў «Чырвонай змене», і ў «Мінскай праўдзе», і ў часопісах). І мяне ўзялі ў выданне на працу! Прыехала чорная «Волга», і забралі вось з той ямы! Я пісаў што хацеў і як хацеў. Першы мой ганарар там быў 100 рублёў — вялікія на той час грошы.

— Далей кар'ера спрыяла творчаму росту?

— Прыехаў з Масквы: куды падацца?.. Зайшоў да Іосіфа Сярэдзіча ў «Сельскую газету» — бяруць! Рабіў там геніяльны нарысіст Анатоль Казловіч, які раней працаваў у «Литературной газете», — штосьці ён даў і мне ў плане вучобы. Потым прыйшла Света Алексіевіч. Гаворыць: «Пакажы, Вася, што ты за 4 месяцы напісаў». Паглядзела, гаворыць: «Слаба, Вася!» Яна ж свой першы матэрыял зрабіла пра дырэктара шкіпінаравага завода. Прачытаў, бачу: выдатна! Трэба цягнуцца, каб быць на ўзроўні! Вось што дала «Сельская газета»…

Прайшлі гады. Іду па вуліцы, сустракаю Валянціна Мысліўца. Гаворыць: «У нас на "літдраме" на тэлебачанні ёсць свабоднае месца. Пойдзеш?». Я падумаў, што ўжо навучыўся ўсяму, чаму мог, аб'ехаў усю рэспубліку, у некаторых раёнах пабываў па 5—6 разоў. Пачало надакучваць… Адно і тое ж: пасеялі — сабралі…

На тэлебачанні рабілі перадачу «Ліра». У студыю з усёй рэспублікі прывозілі настаўнікаў, якія праходзілі ўдасканаленне, запрашалі пісьменнікаў. Людзі пісалі і перадавалі пытанні. Потым раз'язджаліся па ўсёй рэспубліцы і везлі ў душы гэты магутны запал… Шкада, цяпер такіх не робяць… У той час і пачаў пісаць. «Зелле ад скрухі» — першая аповесць (увайшло ў намінаваную на нацпрэмію кнігу прозы пад назвай «Святаяннік»). Надрукавалі ў «Маладосці». Потым і казкі пачаў пісаць. А наша вёска Чурылава — вёска казак. Мае тата і дзядзька былі слыннымі казачнікамі. Дарэчы, тата, акрамя таго, ведаў каля 20 паэм і 200 вершаў на памяць — звесткі пра яго занеслі ў Кнігу рэкордаў Гінеса.

— У вашых творах адметнае спалучэнне: і пісьменніцкі бляск слова, і журналісцкая экспрэсіўнасць. Як дасягнулі такога ўзроўню?

— Больш за ўсё не люблю непрафесіяналаў. Зразумеў, сутыкаючыся ў друку з графаманамі: словам трэба валодаць бездакорна. Таму ў мяне на працоўным стале заўжды слоўнікі сінонімаў, афарызмаў, песні, прыказкі-прымаўкі… Мне пашанцавала нарадзіцца на Міншчыне — менавіта цэнтральная гаворка ўзятая за аснову літаратурнай мовы. А мова старажылаў лілася, як песня, — і я ў гэтым жыў… Акрамя таго, не прапускаю новыя словы, якія ўваходзяць ва ўжытак.

— Чытаючы «Нязванага госця» і іншыя аповесці, верыш кожнаму слову: усё — з жыцця, нішто не надумана, тыпажы рэальныя... Хаця цвярозы сэнс падказвае: немагчыма без мастацкай выдумкі. Цікава: насамрэч якія ў вашых творах суадносіны праўды і вымыслу?

— Калі працаваў у «Военной газете» ў Маскве, усё прыдумваў, пра што пісаў (хаця ўсе лічылі, што пісаў праўду). Айчынныя ж выданні і тэлебачанне, сустрэчы з артыстамі і пісьменнікамі далі ўнікальны досвед на багатым жыццёвым матэрыяле. Пачаў пісаць дакументальна-мастацкія нарысы пра людзей працы. Марк Твен казаў: «Пісьменнік можа мець любую прафесію, акрамя журналісцкай». Я з ім не згодзен. Бо менавіта такое спалучэнне, лічу, і зрабіла мяне пісьменнікам. Што да рэалістычнасці — быў кур'ёзны выпадак. У савецкі час на вокладку кнігі змясцілі малюнак, дзе ўсё было падобна на сапраўднасць: піянеры, абутыя ў лапці. Звоняць з ЦК: «Як так, у лапцях?!» Тады намалявалі ў чаравіках. З ЦК яшчэ больш «увалілі»: палічылі, што піянеры падобныя на бойскаўтаў…

У кнізе, сапраўды, прыдуманага мала. Адсоткаў 80 з таго ў савецкі час надрукаваць было немагчыма. Сюжэт аповесці «Бойся данайцаў» расказала ў бальніцы прыбіральшчыца — рэальны выпадак з жыцця яе вёскі ў ваенны час. «Насіў» яго 20 гадоў… Мімаходзь даведаўся, што падчас вайны па набярэжнай Свіслачы хадзілі дзяўчаты ў нацыянальных кашулях, прадстаўніцы самай старажытнай прафесіі, — зараблялі, як маглі. Калі хто з іх захворваў на адпаведныя хваробы — іх расстрэльвалі ці адпраўлялі ў канцлагер. У аповесці спалучыў гэтыя дзве крыніцы. Надрукаваць і цяпер было складана. У нас склаўся стэрэатып: мы, маўляў, такія праведныя… Хачу падзякаваць рэдактарам «Мастацкай літаратуры».

«Лепру» напісаў даўно… Прыношу ў рэдакцыю, а мне гавораць: змяні, перапішы тры старонкі… Бо ў аснове сюжэта — карупцыйная схема. Я абурыўся: гэта ж мастацкі твор! У галоўнага героя быў прататып. Прафесар, доктар навук, які сапраўды быў у Гвінеі падчас ваеннага перавароту, выратаваў вязня і стаў там галоўурачом, распавёў уласную гісторыю… Падчас працы над творам давялося вывучаць пра хваробу праказу ўсё, што было даследавана. Шмат цікавага высветліў: так, можна з хворым у адным ложку спаць і не захварэць, а можна заразіцца, паразмаўляўшы адзін раз. І гэта непрадказальна. Падтэкст аповесці такі: ці не хворыя мы ўсе трошачкі…

«Нязваны госць» — таксама праўда, гісторыю расказалі. «Танга на мыліцах» — гісторыя, яна адбылася на вачах, у маім двары, з суседзямі. Нават карэспандэнт, пра якога там гаворыцца, сапраўдны. Адзінае, што прыдумаў, — гэта аптымістычная канцоўка. Непрыдуманая гісторыя пра бацьку Махно (у кнізе пад назвай «Незвычайны дыямант»). А вось «Імшару» выдумаў. Гэта, хутчэй, аповесць для падлеткаў.

Фота Кастуся Дробава.

— Што чакаць ад вас далей? Думаю, даведацца пра гэта хацелі б многія чытачы.

— Ёсць задума напісаць твор пад назвай «Плытагоны». Думаю пра яго і дзень, і ноч, нават сніцца… У аснове расповеду — пасляваенны час, калі трэба было адбудоўвацца. Камейша пісаў: «Мы палявалі, пілавалі, душой чысцелі ад расы. Лясы нас вечна ратавалі, не ратавалі мы лясы…» Секлі сосны і сплаўлялі ўніз па рацэ Уздзянцы, далей — Вуса, Нёман і ў Балтыйскае мора. Людзі, якія суправаджалі лес, мусілі вяртацца дахаты сваім ходам. Яны беглі тысячу кіламетраў — паспець бы пасадзіць бульбу. Знясіленыя, засыналі там, дзе іх заспела ноч: хто ў стозе сена, хто і да літоўкі мог прыбіцца. Каб было больш драматычна, увяду ў дзеянне дзвюх-трох жанчын… Прыгоды ў іх — чэрці, ведзьмы, ваўкалакі, вадзянікі… Гэта будзе звінець, дыхаць. І бацька, і дзядзька мае былі плытагонамі — таму дэталі ведаю. Так, напрыклад, каб сосны не патанулі, іх звязвалі шварамі — гэта гнуткае вецце бяроз. Акрамя таго, хачу напісаць яшчэ і пра ваенны час, пра паводзіны чалавека на вайне...

— А што самі любіце чытаць? Ці, наадварот, чаго не любіце?

— Сёння выкінуў адну кніжку, там толькі і паўтараецца ў розных варыяцыях: «ай-ай-ай-мова, ой-ой-ой-мова…» Нельга, каб усё было спрэс сур'ёзна. Лепш бы пра недахопы мовы напісалі! Казах Абай пісаў: «Я ненавіджу цябе, мой казахскі народ! Ты смяяўся з рускіх, а яны ўсе імкнуцца да навукі. Кожны ўзбек больш пісьменны, чым ты. Хто прачытае мяне, калі ты наскрозь непісьменны…» Нашто спяваць асанну мове? Яна ад гэтага не выйграе! Калі была вялікая дэпрэсія ў Амерыцы і здавалася, што яна разваліцца ад крызісу, там стваралі кіно пераможцаў… Мусіць быць аптымізм, жывінка, годнасць павінна быць!

Да таго ж вельмі люблю гумар. Без яго цяжка жыць. Раз і сам трапіў у смешную сітуацыю. Паслалі мяне на завод, на іх рабочае літаб'яднанне рэпартаж рабіць. Іду такі самаўпэўнены, нахабны — на той час ужо ў «Маладосці» друкаваўся — амаль класік! Думаю: што там рабочы можа напісаць?.. Прыйшоў, паглядзеў газету. Бачу: Казімір Гляйхенгаус з харошымі вершамі. Імя незнаёмае. Працуе ліцейшчыкам у цэху. Прыехаў да яго… Выходзіць, такі шыракаплечы, кажа: «Паглядзіце лепш мае песні…» Я думаю: усё, гамон! — якія ты можаш песні напісаць? А ён: «"Мы рабочие парни", напрыклад. А можна "Где-то в посёлке"». А гэта ж была мая любімая песня, вельмі папулярная тады. Гэты чалавек, рабочы паэт, і быў аўтарам той песні…

Шмат смешнага ў жыцці. Маўр меў адметнае пачуццё гумару. Прыходзіў да яго пісьменнік Міронаў. Той сядзіць, узяў нейкія літары, міску. Зрабіў падабенства рулеткі. Кажа: «Задавай пытанне». Пытанне было: «Што пра мяне думае Талстой?» Тут выпадае літара «с», потым — «о»… Атрымалася «сопляк». А Паўлюк Трус, паступіўшы, павінен быў вывучаць ва ўніверсітэце самога сябе: «Падаюць сняжынкі, дыяменты-росы…»

Гутарыла Яна БУДОВІЧ

МЫ ЎСЕ — АДНО ВОЗЕРА

Чытач заўсёды хоча знайсці ў літаратурным творы пэўны адбітак сябе самога, адчуць блізкасць да аўтарскага свету — гэта быццам надае асаблівую значнасць жыццю і асобе, дае адчуванне неадзіноты, вартасці кожнага руху, нават самага штодзённага. Сапраўды, цікава, якія функцыі сёння выконвае мастацтва?..

У пачуцці блізкасці аўтара з чытачом даследчыкі бачаць адну з асноўных прычын папулярнасці літаратуры нон-фікшн. Можна меркаваць, што «літаратура факта» выйграе перад мастацкім вымыслам тым, што яму не трэба нічога асаблівага выдумляць, каб зацікавіць чытача, не трэба штучна фарміраваць актуальнасць — дастаткова быць правільна пабудаваным.

Кніга ў маіх руках — прыклад вострага, блізкага для чытачоў твора ў жанры нон-фікшн. Раман Анкі Упалы «На заснежаны востраў» прысвечаны яе жыццю ў Швецыі.

Напэўна, любая прастора, у якой ніколі не быў, падаецца іншым, ледзь не казачным, светам. Скандынаўскія краіны — гэта паўночныя казкі, магія зімы, змаганне з холадам. Раман «На заснежаны востраў», нягледзячы на заснаванасць на рэальных падзеях, і ёсць сучасная казка пра змаганне з холадам. З чалавечым холадам — адзінотай.

Асноўнае месца дзеяння — Яблычны горад, які хоць і мае быццам казачную назву, але зусім не тое, што Кветкавы або Ізумрудны. У Яблычным горадзе знаходзіцца народная школа, у якой навучаюцца дарослыя — вывучаюць шведскую мову, тэатральнае мастацтва, педагогіку і шмат чаго яшчэ. Працэс навучання апісаны даволі падрабязна, хаця і ўрывачна, і здольны выклікаць зайздрасць у большасці беларускіх студэнтаў. Галоўная гераіня, яна ж — аўтарка рамана, прыехала, каб вывучаць шведскую мову. Працэс авалодання ведамі апісаны вельмі ярка і метафарычна, з усімі смешнымі, няёмкімі і проста непрыемнымі сітуацыямі, з усімі складанасцямі. Але ў выніку чужая мова прырастае як частка цела, становіцца настолькі натуральнай у жыцці Алены, быццам вынялі вату з вушэй. Пісьменніца ўводзіць паняцце «моўная ідэнтычнасць» — абсалютна зразумелае, але чамусьці нечаканае самім фактам свайго ўзнікнення, яно прымушае задумацца пра тое, як уплывае на чалавека не толькі месца, дзе ён нарадзіўся, але і мова, якую ён для сябе абазначае нават не проста роднай і не проста асноўнай для ўжытку, але галоўнай.

Калі камусьці падаецца, што быць білінгвам і ўтрымліваць у галаве дзве мовы — гэта складана, то такому чалавеку лепш не апынацца на месцы аўтаркі. Блытаніна ў дыялогах, часам — нават ва ўнутранай размове з сабой, да таго ж чужая краіна, адсутнасць магчымасцяў да свабоднай і асэнсаванай камунікацыі — моўная адзінота. Гэтае адчуванне замыкае сюжэт у кальцо, але можна сцвярджаць, што яно ўласцівае не толькі пісьменніцы. Амаль усе героі, якія таксама з'яўляюцца навучэнцамі школы і атачаюць Алену, адчуваюць тое ж самае: яны людзі розных культур, з кардынальна розным жыццёвым досведам, рознымі звычкамі, і ім трэба навучыцца існаваць побач.

Усе героі прапісаныя ўрывачна, іх вобразы не маюць прывычнай для літаратурных персанажаў цэласнасці і пазбаўлены штампа «стаўленне аўтара да героя». Ёсць проста жывыя людзі — і з імі хочацца пазнаёміцца. Пісьменніца назірае за ўчынкамі і размовамі, манерамі паводзін кожнага з іх аддалена і не робіць высноў, не выбудоўвае вобразаў — дазваляе чытачам самім скласці ўражанне.

Плаўнасць аповеду і адмова ад ацэнак робяць настрой рамана адпаведным да ўяўленняў чытачоў пра Швецыю: там халодна, там людзі ўмеюць жыць не спяшаючыся.

Яшчэ адна заўважная рыса твора — фрагментарнасць, якая праяўляецца ва ўсім, пачынаючы са структуры і манеры аповеду — маленькія і завершаныя па думцы часткі, унутры якіх вірує своеасаблівая плынь свядомасці. Аднаго сказу часта хапае для адлюстравання думкі, і пасля кропкі пачынаецца зусім іншы кадр. Падрабязнасці побыту, пільнае назіранне за прыродай уводзяцца не проста як дэкарацыі, але і як спосаб аўтаркі спасцігнуць чужы свет, як пошук шляхоў суіснавання з ім. Гэтыя асаблівасці разам ствараюць уражанне кінематаграфічнасці, прычым хутчэй дакументальнай, чым гульнявой.

Кніга падаецца папяровым увасабленнем дакументальнага кіно, бо не толькі распавядае гісторыю пэўных падзей і перадае адчуванні аўтаркі, звязаныя з пэўным часам. Праз кадры хронікі — рэальныя ўчынкі і размовы — паказваецца вялізны зрэз жорсткасцяў рэчаіснасці, якія існуюць па ўсім свеце. Пачынаючы з таго, што ў шведскім інтэрнаце адбываецца тое ж самае, што і ў беларускіх (брудныя кухні, нехта крадзе ежу, суседзі ладзяць гучныя вечарынкі і перашкаджаюць спаць), і заканчваючы глабальнымі праблемамі: розныя формы дыскрымінацыі, гвалт, прадузятасць, войны, наркотыкі, тэрарызм — усё гэта праходзіць перад вачыма аўтаркі, блізка, але не закранаючы яе, і надае твору моцную сацыяльную праблематыку. Праз сутыкненне з варожым светам пісьменніца пераасэнсоўвае свой досвед і погляды, якія найчасцей уласцівыя і большасці з нас.

Гэтая кніга магла б стаць асновай для вялікага кроскультурнага ці сацыяльнага даследавання. Даследчыцкі погляд на ўсё, што адбываецца, характэрны для пісьменніцы. Але яна разглядае сваіх персанажаў не як прыклады ці ілюстрацыі да пэўных сацыяльных працэсаў, а як асоб, проста людзей, са сваімі непаўторнымі характарамі. Развіццё камунікацыі з кожным з іх паказана стрымана, але натуральна — на пачатку не зразумела, хто з герояў стане больш блізкім Алене, як трансфармуюцца адносіны. Але па тым, як асцярожна і ўважліва апісаныя стасункі, зразумела, што гэты досвед абсалютна каштоўны для пісьменніцы.

«...мы жывём усе разам, і я адчуваю крохкасць у людзях… Свет узаемадачыненняў у школе зрабіўся больш зразумелы, а людзі, якія тут працуюць, успрымаюцца як яшчэ больш цудоўныя». Вада ў кране бярэцца з возера — мы ўсе адно возера, разумее аўтарка.

Назва кнігі спасылае да сцэны, калі Алена разам з дзвюма сяброўкамі адправіліся праз тое самае ледзяное возера прагуляцца на востраў і зрабіць фотаздымкі. Гэты фрагмент падаецца фантастычным: гераічнае падарожжа, небяспека і прыгоды, перамога і вяртанне. Увогуле, можна зрабіць выснову, што для аўтаркі Заснежаны востраў і ёсць Швецыя. Ці менавіта Яблычны горад. Ці шведская мова і культура, поўная прыгод і небяспечнасцяў. Ці адзінота, якую трэба перамагчы.

Дар'я СМІРНОВА

Магічны рэалізм сучаснай маўкі

Кнігі — уцёкі ад рэчаіснасці? Ці рэальнасць, што ствараецца на старонках, сапраўднейшая за свет, у якім жывём? Дый ці жывём? Магчыма, жыццё кожнага з нас паасобку — таксама кніга, якую хтосьці піша. Нездарма ж Кузьма Чорны аднойчы адзначыў, што «чалавек — гэта цэлы свет». І свет неверагодна таямнічы і непрадказальны. Але не кожны свет здатны адкрыцца і падзяліцца сваім святлом з іншымі альбо, што цалкам натуральна, не мае ў тым патрэбы, бо не бачыць сэнсу ў адсвечванні ці не мае таленту расказаць так, каб было цікава ў першую чаргу самому сабе.

Свет Юльяны Пятрэнкі — надзвычай яскравы, напоўнены містычнымі і загадкавымі з'явамі, якія не маюць нічога агульнага з так званай фантастыкай, бо ўсім аповедам верыш: так пераканаўча гучаць словы і голас. Нават узнікае адчуванне, што яна сама мае непасрэднае дачыненне да тых з'яў, пра якія расказвае. Ва ўсякім разе, у мяне яно ўзнікла, калі чытаў кнігу апавяданняў «На досвітку», што сёлета выйшла з друку ў Мазырскім КПУП «Калор». На маю думку, ужо ў назве кнігі закладзены яе сэнс: на досвітку ўсялякая інфернальшчына губляе сваю сілу і страчвае флёр жудасці.

З першых радкоў апавядання «Легенда Гром-Возера», якое адкрывае кнігу, Ю. Пятрэнка заваблівае чытача ў патаемныя спраты нязведанага, невытлумачальнага, незразумелага, а таму непрымальнага сярэднестатыстычным абываццелем, бо тое, што нельга растлумачыць, палохае і адвяргаецца цалкам. Чалавек знаходзіць нібыта навуковыя інсінуацыі кшталту ўдзеяння таксічных газаў, наркатычнага выпарэння і г. д., пад якімі прымроіцца што заўгодна. Аднак тое, што ўбачыў ці пачуў, назаўжды застаецца з табой, у тваёй памяці, і яно, прынамсі табой, не паддаецца ніякім сумневам. Як, напрыклад, маладой настаўніцы Віталіне, якая прыехала навучаць дзетак біялогіі ў вёску Старыя Крыніцы і сутыкнулася з Духам возера, што знаходзілася непадалёк ад вёскі ў межах лесу. На тым возеры знікалі людзі. Калі верыць паданню, возера забірала іх як даніну, помсцячы за няўдзячнасць продкаў. Віта нават мела зносіны з Духам возера, не падазраючы пра тое, нават пачала з ім барацьбу…

Апавяданне «Няпрошаныя госці» прыводзіць чытача на занядбаны хутар пасярод зімняй ночы, маўклівай шашы і змрочнага лесу. У маладзёнаў Аксаны і Алесіка зламалася машына пасярод дарогі, якой амаль не карысталіся, але гэтай дарогай закаханыя ехалі, каб скараціць шлях да свайго шчасця. Ваўчынае выццё недзе побач прымусіла хлопца і дзяўчыну шукаць паратунку, якім меўся быць хутар, што паўстаў невядома як проста перад вачыма. Яго гаспадар — стары і таямнічы, без імпэту, але ўпусціў у хату няпрошаных гасцей. Ноч ім давялося прабавіць у страху і невядомасці, бо тое, што адбывалася за сценамі іх сховаў, можна было параўнаць з эпізодамі фільма жахаў. А раніцай — ні хутара, ні старога. Дакладней, руіны колішніх будынкаў.

Надзвычай яскравымі падаюцца апавяданні-маналогі Хатніцы, Ляснога дрэва, дзяўчыны ў Купальскую ноч, якую Лясун прыняў за адну з мавак, дзякуючы чаму ёй удалося знайсці Папараць-кветку, і непасрэдна самой маўкі — маладой і цікаўнай да свету, у якім жывём мы. Хаваючыся пад ваду ад дзіцячых крыкаў, якія напалохалі яе, маўка абяцала абавязкова вярнуцца…

Апавяданне «Авяльга» пераносіць у савецкія часы з калгасамі, працаднямі, хатай-чытальняй... Але не пазбаўляе таямніц і непрадказальнасці: ужо ў назве твора прысутнічае нешта містычнае ці магічнае: Авяльгой назвала сваё дзіця-немаўля Зоська — разумова непаўнавартасная дзяўчына, якая нарадзіла невядома ад каго. Зрэшты, так здаецца тым, хто яе атачае. Сама Зоська кажа, што бацька дзяўчынкі — лясны Цар, які аднойчы прыйдзе па яе і забярэ з сабой. Неўзабаве дзяўчыну знаходзяць мёртвай на беразе рэчкі з тварам у вадзе і рукамі крыжам…

«Чужая вясна» — адзіны твор у кнізе, што не мае ніякага дачынення да тагасветных з'яў, аднак і ў ім хапае цікавостак і таямніц. Апавяданне-рэбус з псіхалагічным ухілам прыводзіць чытача разам з галоўнай гераіняй — дзяўчынай Маяй — у хату да ўдвая старэйшай за яе жанчыны Антаніны... Сюжэт цікавы зместам і знаходкамі. Героі не чуюць адзін аднаго, заблытваюцца ў павуціне непаразумення, што часам нагадвае камедыю становішчаў...

Напрыканцы кнігі Ю. Пятрэнка ўражвае паданнямі пра Алельку-рыцара, напоўненыя подзвігамі, але не гераічнымі, як павінна быць у падобнага кшталту жанры, а хутчэй алегарычнага зместу. Алелька-рыцар з-пад пяра пісьменніцы — антыпод усяму рыцарству, такі сабе анты-Геракл, які змагаецца з тымі ж пачварнымі стварэннямі, але не сілай, а розумам, кемлівасцю. Ён рыцар міжволі, як акцёр на сцэне, што трапіў у навязаныя яму абставіны. Як ён перамог Змея-Цмока, які тэрарызаваў паселішча Палынка і забіраў з сабой прыгажунь-нявінніц?.. Усе папярэднія рыцары гінулі, як адзін, у няроўным двубоі з цмокам... Алелька разумеў, што і яго чакае тое самае, таму зрабіў хітра... Змей пераможаны, якім чынам — неістотна. У гэтым творы — талент пісьменніцы, талент тонкага назіральніка і псіхолага, які мае да таго ж рэдкае адчуванне мяжы паміж проста сцёбам і мастацкасцю. Выснова падмацоўваецца неверагодна захапляльнай чароўнай казкай «Змеева Дуброва», што больш нагадвае невялікую фэнтэзійную аповесць, дзе вядзецца размова пра самаахвярнасць і адданасць, паўстаюць пытанні пра найлепшыя якасці чалавека, якія шляхам шматлікіх перашкод усё ж узносяць яго да нязведаных вышынь, і толькі дзякуючы ім чалавек і завецца чалавекам. Гэтым творам Ю. Пятрэнка як бы завяршае аповеды маўкі, самай сапраўднай маўкі, якая выйшла з ценю іншага вымярэння, каб распавесці пра свой свет і паспрабаваць застацца ці хаця б зачапіцца за свет, у якім жывём мы, бо ўсе магчымыя вымярэнні ў сусвеце знітаваныя адзін з адным нябачнай повяззю.

Некалі Л. М. Талстой, прачытаўшы апавяданні Л. Андрэева, якія вылучаюцца нагнятаннем страху ў змесце, сказаў яму: «Ты палохаеш, намагаешся, і гэта адчуваецца ў кожным радку, настрашыць чытача так, каб у яго валасы пасталі дыбарам, але мне не страшна». І не растлумачыў, чаму. Мне здаецца, сэнс тут у тым, што жахі Л. Андрэева нараджаліся не ад жыцця, а ад розуму, то-бок, яны больш надуманыя, непраўдападобныя. «На досвітку» Ю. Пятрэнкі — кніга не страшная, не забаўляльнае чытво пад піва і чыпсы, але ўнутранай жудасці ў ёй хапае, бо здаецца, нібыта ўсе гісторыі адбыліся з самой аўтаркай. А гэта значыць, што Юльяна валодае магутным пісьменніцкім дарам.

Мікола АДАМ

Восень як прыстанак душы

Знаёмства з новым зборнікам вершаў Дзмітрыя Пятровіча «Святло адвечнай песні» (Мінск, Колорград, 2018) — як вандроўка па коле часу, па паравінах года. Кожная з іх для паэта — адметны час і свет, які не менш ад астатніх значны і знакавы. Так, у вясне жывуць яго мары і здзяйсняюцца надзеі, у леце віруюць пачуцці, у зіме — адхланне і ўспаміны, а ў восені жыве душа. Тут яна аднаўляецца пасля разбурэння і таго, што мела адбыцца ды не здзейснілася, альбо пасля расчараванняў у сабе, іншых, каханні, адносінах... Здавалася б, холад, дажджы, золь, маруднае паміранне ўсяго навокал — але для паэта гэта час аднаўлення жыццёвых сіл і натхнення. «Восеньскіх» вершаў у зборніку найбольш — ці значыць гэта, што восень — улюбёная пара для паэта? І калі так, то за што ён яе любіць?

«Задуменная восень на гонях маіх каралюе, / Накрывае туманам азяблым сівую зямлю, / Серабрыстаю фарбай на звялай лістоце малюе, / А ў яе шапаценні я чую, як рэха: "люблю..."» — мяркую, менавіта ўвосень паэт адчувае сябе жывым. Што гэта значыць? Тое, што яму баліць. Расстанне, недалюбленасць-незадаволенасць, страта, непазбежны надыход зімы...

Магчыма, чытач будзе спрачацца: няўжо, калі пануе лета, калі шал кахання закручвае ў жарсцевым танцы, жыццё — менш? Адказваю: жыццё ў тым сапраўды не менш, але... Калі чалавек найчасцей згадвае, напрыклад, уласную руку? Тады, калі парэжацца — бо парушаецца звыклы ход падзей: ён не можа, як раней, працаваць, кожны рух аддаецца болем... Так і з душой: хіба мы заўважаем, што шчаслівыя, калі шчаслівыя па-сапраўднаму? Не, толькі потым, калі шчасце мінае, гасне, блякне...

Вось апісанне: лірычны герой побач з аб'ектам кахання, дзея адбываецца на прыродзе, ля мора, пад лагодным крымскім сонейкам — здавалася б, ідылічная карціна шчасця: ні адняць, ні дабавіць. Але чамусьці не кранае: *«Цыкады гучна бласлаўляюць лета — / Шчаслівы час для грэшнае любві. / Кафэ. Шашлык з бакалам амарэта. / Алькоў. Двух ценяў танец... Сэ Ля Ві...»* Міжволі згадваеш распаўсюджанае меркаванне: шчаслівыя вершаў не пішуць...

Але там, дзе «баліць» па-сапраўднаму, адразу адчуваецца. Надзвычай яркі вобраз, створаны паэтам, — на карысць таго, што ён перажыў і адчуў напоўніцу ўсе рухі-адценні-сумненні збалелай, зняверанай душы:

*«***Сыпле верасень лісце на струны азяблай душы, / Хуткі холад зімы ці падасца нямым ратаваннем?.. / А на сэрцы — засечкі крывавыя, быццам крыжы, / Што паўстануць як вехі жыцця сонным стомленым раннем...»*

Дзмітрый Пятровіч — тонкі лірык. Вобразы яго нязмушаныя, лёгкія, арганічныя. Вершы гучаць як песні, прычым улюбёны аўтарскі рытм — вальс: *«Ночы шэпат-замілаванне... / А на шыбінах — кужаль снежны. / Цені два... Тут жыве каханне. / І няма ўжо ні сцен, ні межаў...»*, *«І прачнецца аснежаны горад / Пад прыгорблены спеў ліхтара...»*, *«На белым снезе, яркім ад крыві / Зарыплашча параненага сонца, / У сумным вальсе вечнае зімы / Закружаць нашы цені...»*, *«Барвовыя начэпіць эпалеты / Уладна восень»*, *«Адчуем мы, як свет застыў, заціх, / Разліўшы сок зары на рукі вішні...»*

Наперадзе — снежныя завеі. І гэты час нічым не горшы за іншыя часіны. Проста ў кожнай паравіне — свая радасць і свой сэнс, унікальны досвед спазнання жыцця. Кожная з іх для чагосьці патрэбная, як звёны ў ланцужку пераўтварэнняў: выпадзе адно — і згубяцца астатнія, страцяць сябе ў эвалюцыйным цыкле.

...Восень таксама любіць паэтаў.

Яна БУДОВІЧ

КАНТАТА ВЕЧНАЙ САМОЦЕ

Кніга «Самасць» (Мінск, Колорград, 2017) Бажэны Мацюк зачароўвае сваім майстэрствам, упэўненасцю, прафесіяналізмам. Аўтар ведае, пра што піша, умее ў сціслай, лаканічнай форме выказаць многае. Вершы ўражваюць пэўным арганным гучаннем. Асабліва гэта датычыцца твора «Я чакаю сваёй самоты…». Чытаеш гэтыя строгія, нейкія нават нардычна-ўзвышаныя радкі і як быццам апынаешся ў чароўнай прасторы музыкі Пахельбеля альбо Букстэхудэ.

Гэтыя вершы для прыхільнікаў халодна-дэпрэсіўнай восені, дзе пранізлівыя вятры пяюць кантату вечнай самоце. Часам у іх поруч з мінорнымі настроямі адчуваецца нейкая вастрыня, пачуццё няўтульнай небяспекі («А хлопчык збіраў каштаны… / На слізкіх шкляных прыпынках…»), пануе пачуццё «расстралянасці» («Мой вечар — расстраляны») і ўсяго таго, што было ўласціва героям ранняй прозы Кузьмы Чорнага.

У той жа час агульна-самотны настрой кнігі мае пэўную тэатралізаванасць, як быццам усё гэтае цёмна-шэрае восеньска-шкляное, арганна-расстралянае змесціва яе свету — усяго толькі фантазія, пэўны прыём, каб зацікавіць, завабіць, прыцягнуць увагу. І спадарыні Бажэне гэта акурат удаецца.

Праўда, хацелася б, каб кніга мела не такі дробны і выкрунтасісты шрыфт, бо многія па-сапраўднаму цудоўныя вершы з цяжкасцю чытаюцца і ўспрымаюцца.

Увогуле ж, шаноўную паэтэсу можна павіншаваць з надзвычай цікавай, творчанеадназначнай кнігай. Беларуская паэзія павінна здзіўляць. Правакаваць. Дражніць. Спакушаць. Злаваць. Радаваць. Словам, выклікаць моцныя жывыя пачуцці.

Што і адчула я, калі гартала кнігу Бажэны Мацюк «Самасць».

Вольга ПЕРАГУДАВА

Смак паэтычнай усхваляванасці

Пару месяцаў таму пабачыла свет кніга лірыкі «Зямныя эцюды» вядомага беларускага паэта Віктара Яраца. Гэты гомельскі творца нядаўна адзначыў свой 70-гадовы юбілей, да якога падышоў з вялікім творчым багажом у выглядзе некалькіх зборнікаў вершаў, кандыдацкай дысертацыі па айчынным паэзіязнаўстве, падборкамі перакладаў замежных паэтаў на беларускую мову. Структурна гэтая невялікая па аб'ёме кніга падзелена на тры часткі: «Лікі Храма», «На беразе сонца», «Воблікі вёрстаў». Амаль усе вершы зборніка рыфмаваныя, прычым адразу здзіўляе тое, што ніводны з больш чым васьмідзесяці змешчаных у кнізе вершаваных твораў не мае… назвы. І тут адразу паўстае пытанне: а чаму так? Дакладнага адказу не ведаю, аднак магу выказаць здагадку, што, мажліва, такім чынам аўтар хацеў не адцягваць увагу чытачоў на чытанне/асэнсаванне гэтых назваў, а проста разгарнуць своеасаблівы паэтычны скрутак, дзе вершы без усялякіх перашкод нібы перацякаюць адзін у адзін, перагукаюцца між сабой.

Затое ўсе творы адпавядаюць назве зборніка: кніга акурат і складаецца з больш-менш удалых (а часам і бліскучых) паэтычных эцюдаў таленавітага паэта-гамельчука, якія ахопліваюць даволі шырокі спектр тэм і вобразаў. Вершы Віктара Яраца заўжды лаканічныя, маляўнічыя, прычым кожны з іх змяшчаецца на адной кніжнай старонцы і па аб'ёме найчасцей не перавышае васьмі — дзесяці вершарадоў.



Пры чытанні кідаецца ў вочы і нават уражвае незвычайна вялікая колькасць пытанняў і пытальнікаў — тут іх каля паўсотні. Ледзь не ў кожным другім вершы аўтар задае па адным, а то й па некалькі важных для яго пытанняў, аднак звычайна не дае адказаў, што нярэдка пакідае ў стане няведання, няпэўнасці. Відаць, паэт задае пытанні і спрабуе знайсці на іх адказы дзеля таго, каб праясніць хаця б для самога сябе некаторыя спрэчныя моманты, залагодзіць былыя канфлікты і непаразуменні. Лічу, што гэты адмысловы «запытальны пафас» сведчыць пра тое, што душа ў сталага паэта засталася па-ранейшаму маладая і што ён не страціў важнай для кожнага сапраўднага паэта здольнасці здзіўляцца свету і яго шматлікім насельнікам.

Увогуле, кніга ўяўляе сабой збор надзіва пранікнёных і кранальных вершаў, у якіх любоўна выпісаны партрэты жывых і памерлых сваякоў, сяброў і землякоў. Бачна, што аўтар імкнецца шчыра паважаць і любіць практычна ўсіх, з кім сутыкаецца, акрамя тых, хто акрэсліваецца ім як «чэлядзь бесхрыбетная». Дзе эмацыянальна-ўзрушана, а дзе і па-філасофску стрымана, мудра аўтар ставіцца да розных — часам драматычных і трагічных — жыццёвых сітуацый і калізій. На маю думку, своеасаблівую квінтэсэнцыю кнігі складае наступны верш, які прыводзіцца тут цалкам і адлюстроўвае галоўныя аўтарскія тэмы і матывы:

Далёка ад храмаў непальскіх, індыйскіх,
далін афрыканскіх, дзе цёпла зімой,
снег лёг на світанні на сцежку
дзяцінства —
яе называюць гадоў сувязной.

І сонца Ван Гогам эцюды іскрыстыя
стварае ў сяброўстве з бярозай, сасной.
Снег лёг на світанні на сцежку
дзяцінства
ці ж толькі адной вышыні сівізной?

У гэтым кароткім вершаваным творы хораша выяўлены амаль усе адметныя рысы паэтычнага светабачання аўтара — яго роздумная ўсхваляванасць, шчымліва-пытальная інтанацыя, яркасць вобразаў, а таксама шчырая любоў да роднага кутка і тамтэйшай прыроды. Гэта своеасаблівы жывапіс словам, калі перад вачыма паўстае адразу ўся намаляваная карціна-верш, ці, дакладней, эцюд-верш. Пры гэтым, аднак, паэт добра адчувае не толькі выратавальны патэнцыял любові, але і я яе здольнасць балюча раніць як чалавека, так і саму зямлю:

Снег ідзе — ён так хоча аб нечым
расказаць пракаветнай зямлі,
на якой столькі ран чалавечых —
ад любві, ад любві, ад любві…

У кнізе сустракаецца нямала арыгінальных метафар, сярод якіх наступныя: «Маршчынаў сець — то вязь начэй і дзён / з надзей і страт, і з радасці, і з гора...»; «След самалёта — бінтамі / над захаду ранай чырвонай»; «Словы, якія вячэрнія зоры — / транслятары космасу — / будуць іншым даносіць планетам / пра ўсіх, / каго на зямлі згубілі»; «Свет — ён соты адвечных турбот»; «Хвалі хваляць адна адну / і бягуць, і бягуць талакою». Праўда, разам з тым часам у кнізе зрэдку можна знайсці, на мой погляд, і відавочна надуманыя, штучныя альбо празмерна мудрагелістыя вобразы, якія наўпрост псуюць уражанне ад верша: «Зорка азяб-ла ўздыхне — і танометрам / мерае месяц / ціск заінелай бярозы на лёдам / прыціхлай ракі»; «І ў вокны цішыня маўчанне панды / заглядвае з далёкіх берагоў»; «апорамі трывог высакавольтных / ідуць за небасхіл расстання дні». Аднак у цэлым новая кніга лірыкі Віктара Яраца пакідае пазітыўнае ўражанне і даволі прыемны паслясмак.

Эдуард ДУБЯНЕЦКІ

Настасся НАРЭЙКА

Максіму

1

Ты назаві Веранікай мяне.
Ты назаві.
Ціха насоўку тваю падніму.
Хай у крыві.
Ціха ў празрыстыя вочы зірну.
Там — іншасвет.
Нехта сказаў: ты сыходзіш ужо.
А запавет?
Верш застанецца, слабое рукі
Росчырк адзін.
Слова адно застанецца яшчэ.
Слова-палын.
Слова адно, што мацней ад усіх
Велічных слоў.
Слова адно — Вераніка. Яно
Ў сэрцы ізноў.
Гэта імя мне, на жаль, не насіць.
Мары як дым.
Думаеш, рэўнасць з'ядае мяне?
Справа не ў тым.
Справа ў віне, што спазнілася я
З вечным «Жыві!».
Ты Веранікай мяне назаві.
О, назаві…

2

Сухоты прыходзяць да тых,
Хто дыхаць хацеў
Спраўна,
Бы ў келлі зачынены мніх,
З якім — малітва
Адна.

Сухоты прыходзяць да тых,
Чый голас усім —
Арган,
Чый голас ліецца з кніг,
Бы кроў з непрамытых
Ран.

Сухоты прыходзяць да тых,
Каго душылі
Дарма.
Не знішчыць песень жывых,
А мёртвых — павер —
Няма.

Сухоты. І мора сінь.
Ты дыхай. Жыві!
Жыві…
Ты кніжку сваю пакінь —
«Вянок»
З жыцця і любві.

3

Я гляджу на цябе і адно
Разумею даўно незвычайна.
Што кахаю цябе даўно.
Што кахаю цябе адчайна.
Мне да болю цябе не стае.
Ну і што? — Не апошня, не перша.
І не варты ўсе кнігі мае
Твайго — адзінага — верша.

4

І бег цягнік.
І Вечнасць адступала.
Бяссіла.
Апусціўшы галаву.
За крокам крок.
І слёзы як навала.
А ён: «Куды?
Я больш не пражыву…»

І Вечнасць
Не магла сказаць нічога.
І не было
Такіх вялікіх слоў.
І Вечнасць
Азіралася на Бога.
А ён: «Куды?
Я ўжо даўно гатоў».

І бег цягнік.
І грукат колаў гэты,
Нібы гадзіннік,
Тахкае ўнутры,
У сэрцы, у вантробах.
І няспеты
Марнее верш з апошнім:
«Забяры…»

І Вечнасць нахіляецца
Нячутна
Да вуснаў, што бялейшыя
За снег,
І слухае, і ў памяці
Пакутна
Крывёю піша верш,
Нібыта грэх.

І слова, што апошняе,
Што важна,
Важней за словы ўсе,
Прамовіць ён:
«Не бойся. Мне, празрыстая,
Не страшна.
Мінаю я.
І твой цяпер закон».

І бег цягнік…
І спаў стамлёны ціха.
І белы лоб быў чысты
І пусты.
І Вечнасць стала ўся
Суцэльным слыхам.
А што пасля сябе
Пакінеш ты?

Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА

***

Цераз цёмныя, цёмныя, цёмныя ночы,
Цераз доўгія, доўгія, доўгія дні
І пакуты, што кропельку шчасця
прарочаць,
Цераз вуліцы, сцены, дамы і агні,
Праз хваробы і страты, што поўняць душу,
Цераз бед беспрасветную даўкую стынь —
Я чакала. Прыйшоў Ты. Зіма… І прашу:
Ні мяне, ні сябе — не пакінь, не пакінь…

ЛЕТНІ РАНАК

А цішыня званчэй звініць,
І так таемна льюцца гукі.
Ды ноч усё-ткі не спыніць.
І асалода мне, і мукі,

Што цуд знікае неўспадзеў.
Таму й на сэрцы горка-млосна,
Бо казка чэзне паміж дрэў…
Балюча гэта. Невыносна…

Растане месяца брыво,
Не дачакаўшыся патолі.
Паўсюль — такое хараство!
То — летні ранак. І не болей.

КУПАЛЬСКАЯ НОЧ

Зіхцелі яблыні наўкруг
За тры хвіліны да рассвіту.
Купала лета пад ракітай
Суквецці лотаці ў стаўку.

І хмары ў небе чарадой
Плылі кудысьці без замінкі.
На лісце скрыпеню расінкі
Лажыліся, каб стаць вадой.

Таполі — з верху да камля —
Імкнулі ў марах за аблокі,
Нібы багі з часоў далёкіх,
Чый дом — палеская зямля…
О, дзе ж вы, песні салаўя?!
Яшчэ ж ва ўсю буяе лета!
Агні Купалля: дом мой светлы,
Айчына любая мая!

***

Яшчэ не восень, толькі ўжо й не лета.
Рабіна стыне, ды чырвоніць высь.
Яшчэ агнём самотным не сагрэта,
Яшчэ і сэрца б'ецца, як калісь.

Яшчэ ў сабе затойвае уздым,
А восень прыйдзе — і гарэць рабіне,
Калі вятроў халодны несутрым
Убор яе на дол рашуча скіне.

І размяняе лета на рублі.
І сіняву прарэжуць жураўлі…

ВОСЕНЬ МАЛАДАЯ

Жаўцелі — ад сонца — сукенкі асін,
Чырвоныя клёны ў нябесную сінь
Глядзелі, зялёныя згадвалі сны…
А ранкам — услалі зямлю туманы.

Нібыта фатою, накрылі абсяг —
Лагчыну, рачулку, заезджаны шлях.
Дуброва была залатой-залатой,
А восень — такой маладой-маладой!

Такой маладой, маладзей ад вясны,
Такой залатой, як дзіцячыя сны…

***

«Вам болей не ўладарыць нада мной», —
Я думала. А сёння падаецца:
Жыць, можа, прызвычаюся з віной,
Хоць горыч-боль на сэрцы застанецца.

Як застанецца здрады рубікон,
Апёк душы — маланкавы, без грому —
І цемра непрасветная акон
Даўным-даўно пакінутага дома.

***

Крыху пазней — і па адным радку
Уявіш ты майго жыцця юдолю,
Як я жыла ў далёкім гарадку,
А ты шукаў няўрымслівую Долю.
Напэўна, шчаслівейшы за мяне
(Я так хачу!), знайшоў яе, канечне.
Няхай цябе другая прыхіне,
А я твае намеры ўсе адпрэчу
Той сілай, што не выказаць услых,
Што набліжала нашай стрэчы міг
На паўдарозе да зямнога раю…
«Крыху пазней…» — упарта паўтараю…

З рускай мовы пераклаў
Мікола ШАБОВІЧ

Алесь ЕМЯЛЬЯНАЎ-ШЫЛОВІЧ

Транстромер і акуляры

твае акуляры ляжалі на
кніжцы Транстромера
нібы напамінаючы што
глядзець на
гэтую кніжку трэба праз
павелічальныя шкельцы і
паэзія наогул у прыватнасці
шведская дазваляе зірнуць на
свет такім позіркам як у
маленстве пакуль не
насіў акуляры

***

уверх зірні
там неба высокае
не зважаючы што зіма
на голых галінках таполевых
каралі ліловыя
уверх зірні
не бойся што плюхнешся долу
як гэтая кропля
прызнайся сабе
што не ўмееш падаць
бо развучыўся ўставаць
памятаеш як у маленстве
ты падаў і не баяўся
смяяўся
бегучы па лужах
пазіраў на аблокі
а яны ўсміхаліся з вышыні

сучаснае рыфмаванне

глытаць глютамат
каўтаць сублімат
а паўсюль рафінад рафінад
рафінад
і за шчасце падасца любы
канцэнтрат
бо з-пад крану ліецца суздром
перхларат

злоўжываць дыстылят
альбо рэктыфікат
гэта вельмі сучасна
шаноўны мой брат
адно ведай
ты ўжо экспанат
экспанат

сутычка

…яны сутыкнуліся ў цэнтры
сталіцы
ілбамі
бо занураныя ў айфоны
не бачылі адно аднаго
у яго здох вінчэсцер перагружаны
гігабайтамі
у яе заглючыла аператыва
яны сутыкнуліся і забыліся словы
якія звычайна кажуць
і кожны пайшоў у свой бок
пасля ён падумаў
дзеўка нішто сабе
а яна
трэба яго адшукаць
у VK…

інфінітыў

трава не вартая гною
траву не бярэ каса
з яе робяць газоны
абстрыгаюць нажніцамі

у траве не жывуць казюркі
траву выстаўляюць на продаж
трава не мае выйсця
яна не ў стане рухацца
і ўхіляцца ад ветру
трава ў інфінітыве

усяго найлепшага

ні табе мора ні гары
туман ды хмары ды вятры
ляжыш парою дагары
і разважаеш — а гары
яно ўсё гарам
а мо да чорта ўсё стары
скруціць адсюль у пяты рым
бывай
всего
wszystkiego
*viso gero**

*Усяго найлепшага (літ.)

ЗЭКавычкі-3*

Кароткія былі

Анатоль ЗЭКАЎ

Вам «ЗЭКавычкі» прадстаўляю
Без усялякай звышзадачы.
Іх я зусім не выдумляю,
Адно — запісваю, што ўбачыў.

ГЕРОЙСКІ ЎЧЫНАК

Калі мужчыны пачынаюць размову пра вайну, дзядзька Мар'ян не прамінае, каб не пахваліцца:

— А я таксама геройскі подзвіг здзейсніў.

І хоць усе ўжо не адзін раз чулі пра яго подзвіг, пачынае распавядаць:

— Мадзьяры ў нас на станцыі стаялі. Там і будачка ў іх была. З печкай жалезнай. Але ежу сабе на вогнішчы гатавалі. Вось мы, падлеткі, і ашываліся каля іх. То дроў папросяць нарыхтаваць, то посуд памыць, то яшчэ што… За гэта цукеркамі пачастуюць ці галету дадуць. А то і марку адшкадуюць, хоць што з ёй рабіць, мы і не ведалі.

А неяк папрасілі мяне курыцу абскубці. Я, не доўга думаючы, і кінуў яе ў вогнішча.

— Што ты робіш? — крыкнуў мадзьяр і замахнуўся на мяне лазінай, што ляжала побач. — Я ж сказаў абскубці!

— А навошта скубці? — адскочыўшы ўбок, выгукнуў я. — У агні пер'е само абгарыць…

Лазіны па спіне я, канечне, атрымаў. Яшчэ колькі дзён павярнуцца не мог.

— Ды табе, Мар'ян, за такі подзвіг павінны былі медаль даць, — зубаскаліць сівы, як палын, Рыгор.

— Пэўна, і далі б, каб было каму прадставіць, — пагаджаецца Мар'ян. — Але ж ніхто не бачыў.

— Дык, можа, нічога такога і не было? — не адступае Рыгор.

— Ага, не было. Было, яшчэ як было, — неяк нават жаласліва мармыча Мар'ян і скрабе спіну, нібыта гэта не ў вайну, а ўчора адхадзіў па ёй лазінай раззлаваны мадзьяр.

ЗГУБЛЕНАЯ ПАЛЯНКА

Гэта было яшчэ ў маім маленстве, калі і кароў (а то і не адну) трымалі ў кожным двары, і сена здабывалі дзе хто мог. Нават сярпамі выжыналі з-пад кустоў у лесе.

Бывала, пабяжыць бацька на досвітку ў лес, знойдзе якую палянку з пятачок, абкосіць вакол — маўляў, ужо занятая — і бяжком шукаць наступную. Некалькі такіх пятачкоў абазначыць, а потым адну за адной па чарзе дакошвае.

Неяк вярнуўся пасля абеду дахаты, ушчэнт раззлаваны.

— То ж, — кажа, — шэсць палянак абкасіў. Пяць знайшоў, а шостую — не. Дзе толькі не хадзіў — няма. Як скрозь зямлю правалілася.

З ДЗВЮХ БАБУЛЬ

У майго ўнука Мікіты — дзве бабулі, Зіна і Ала, і адзін дзед, я.

Да бабуль ён ездзіць разам з маці; мяне ж, як правіла, наведвае самастойна. На канікулах удваіх ездзім і ў маю Патапаўку.

Неяк задаю яму, як зразумеў потым, антыпедагагічнае пытанне:

— Якую з дзвюх бабуль ты любіш больш — Зіну ці Алу?

А Мікіта, ні хвіліны не задумваючыся, выпальвае ў адказ:

— З дзвюх бабуль болей за ўсё я люблю цябе, дзед.

Схітрыў ці праўду сказаў, не ведаю.

У САМЫ РАЗ

Унук пасля летніх канікулаў першы раз пайшоў у школу.

Вяртаецца і гучна аб'яўляе:

— А ў нас новая класная!

— І як яна? — цікаўлюся.

— Табе, дзед, у самы раз, — адказвае.

А я ўяўляю, які гэта «самы раз» для дзеда.

ХТО НЕ ЛЮБІЦЬ ЛАСКІ?

На досвітку з начнога палявання, а можа, і са спаткання, вярнуўся кот Васька. Бачу: скача на трох лапах, а трэцюю, заднюю левую, падкурчыў пад сябе: ці падбіў хто, ці, можа, сам дзе параніўся.

Паснедалі з бацькам, сядзім на канапе. Лёг побач і кот. Гладжу яго, з боку на бок паварочваецца, а то і на спінку ўгары жыватом ляжа. Падабаецца…

Пасля абеду бацька звычайна ідзе ў спальню і з гадзіну перад тым, як пайсці ў сваю майстэрню, адпачывае. «Няхай тлушч вакол пупка завязваецца», — кажа.

Ляжу і я на канапе, чытаю. Побач прытуліўся і кот. Адной рукой трымаю кнігу, другой пагладжваю Ваську.

Бацька, выйшаўшы са спальні, ківае на ката:

— Во дзе ён, валацуга. То ж, бывала, лягу — і кот каля мяне. А то гляджу: няма. Што значыць — пагладзіў. Любіць ласку…

КЛЁНІКІ І ЗАЙЦЫ

Увосень прынёс з лесу і пасадзіў у канцы агарода на поплаве два маленькія клёнікі. А зімой зайцы аб'елі іх да самага кораня. Аж засмуціўся, убачыўшы такое вясной, калі снег сышоў з поплава.

Ды толькі ажылі мае клёнікі, зазеляненелі.

На наступную зіму, навучаны горкім вопытам, абгарнуў дрэўцы сасновымі лапкамі. Цяпер да іх ствалоў ніякім зайцам не дабрацца.

МЕХ ЦЫБУЛІ

Маёй суседцы прывезлі восенню мех цыбулі. Столькі і за год не з'ясі, не тое што за зіму. Як ні захоўвай, а гніе.

— Дык я рассцялю на падлозе газеты, высыплю з меха, перабяру, абрэжу падгнілыя, каб есці, астатнюю — зноў у мех, — апавядае суседка. — Некалькі разоў за зіму той мех ператрусіла. Так, лічы, гнілую і паела.

СПЕКТАКЛЬ З БАЯВОЙ НАЗВАЙ

У тэатры кінаакцёра, дзе ў той вечар паказвалі спектакль «Поле бітвы», за дзесяць хвілін да пачатку дзейства — лічаныя гледачы. Не разумею, што здарылася: у тэатры ж звычайна аншлагі.

І раптам у залу строем заходзяць воіны і запаўняюць усе вольныя месцы.

Чамусьці мільганула згадка: пэўна, зампаліт, зірнуўшы на афішу, скеміў: «Поле бітвы» — значыць, пра вайну, і вырашыў такім чынам далучыць воінаў да мастацтва і адначасова ўзняць баявы дух.

Насамрэч жа спектакль — камедыя з сямейнага жыцця. Праўда, байцоў ён наўрад ці засмуціў: насмяяліся ўволю. А баявога духу ім і на занятках хапае.

«ТОКАР»

У адным вагоне едуць два былыя аднакласнікі: Іван і Алег. Колькі гадоў не бачыліся! Разгаварыліся. Пра жыццё-быццё, пра сям'ю ды дзяцей. Алег, больш гаваркі, распавёў пра сябе ўсё, а потым цікавіцца ў напарніка:

— Твой малодшы, здаецца, ужо скончыў школу?

— Ды скончыў, — неахвотна цэдзіць Іван.

— А на каго цяпер вучыцца?

— На токара.

— Па метале ці па дрэве?

— Па хлебе і сале. Дома, без адрыву ад кухні, — цалкам сур'ёзна адказвае Іван.

ПАДАРУНАК З ВОДАРАМ

Напярэдадні Дня сталых людзей, які адзначаецца штогод, Колеў зяць Валодзя пайшоў да дырэктара саўгаса, каб выпісаць гною. Размову пачаў здалёку:

— Ведаеце, Сяргей Максімавіч, якое ў суботу свята?

— Так. Дзень сталых людзей.

— А як вы іх віншаваць думаеце?

— Падрыхтавалі паштоўкі, сёння адправім. А вашым адразу можам аддаць, зараз паклічу сакратарку.

— Не трэба, — Валодзя ўзняў угору руку.

— Ну, як хочаце, — не супраціўляўся Сяргей Максімавіч.

— А хачу я вось што. Можа, які б каштоўны падарунак выпісалі. З водарам.

— Што вы, на падарункі ў нас грошай няма, тым больш на каштоўныя, ды яшчэ з водарам.

— А грошай не трэба, наадварот, я вам сам заплачу.

— Як гэта? — не зразумеў дырэктар. — Цікава, і што б вы хацелі ў якасці падарунка?

— Каб вы ім цялежку кароўскага г… выпісалі.

— У сэнсе — гною?

— Менавіта гною, калі вам падабаецца больш культурнае слова.

Дырэктар усміхнуўся на такую незвычайную просьбу і, махнуўшы рукой, выгукнуў:

— Пішыце заяву. Выпішу вам гэтага, як вы там сказалі… З водарам. Парадуем ветэранаў, — і зноў усміхнуўся.

КУРЫ І ПЕЎНІ

У бацькі чатырнаццаць курак і два пеўні.

— А навошта два? — пытаю.

— Ды падумаў, што на аднаго мнагавата будзе. А на двух — самы раз. Спраўляюцца, — усміхаецца бацька і дадае: — І не б'юцца паміж сабой. Курак жа кожнаму хапае.

Калі ж маці хварэла і бацька сядзеў каля яе, амаль не адыходзячы, у гаспадарцы былі толькі адна курка і певень.

— Парка, — казаў бацька. — Усё, як у людзей.

МАЦІ-ГЕРАІНЯ

Сын купіў зямлю за дваццаць кіламетраў ад Мінскай кальцавой дарогі па Брэсцкай шашы. Пабудаваўся, завёў гаспадарку. Там у яго і авечкі, і свінні, і гусі, і куры. Апошніх — шаснаццаць. І адна толькі белая, астатнія ўсе пярэстыя.

Вось гэтая белая якраз і ўразіла. Жывучы ў вёсцы, я ніколі не бачыў ды і ні ад каго не чуў, каб курыца за лета два разы садзілася на яйкі. А на старасці гадоў пабачыў.

Па вясне вывела дзесяць куранятак. Павадзіла іх лета, паставіла пісклятак на ногі ці на крыло, як тут лепш сказаць, — і знікла. Пашукалі мы яе з дзень-другі ды і махнулі рукой: няма дык няма, можа, коршак які ўхапіў — лес жа вунь побач.

Толькі і заўважылі, калі ў траве за суседавым плотам пачулі піск куранятак. Дык вось, аказваецца, дзе была ўвесь гэты час наша прапажа. Ну чым, скажыце, не маці-гераіня? Хай сабе і курыная.

У ПАЛІКЛІНІЦЫ

Не люблю хадзіць у паліклініку — асабліва з позняй восені і да ранняй вясны. Менавіта ў гэты час бабулі, хоць і сам я ўжо дзед, закрыўшы дачны сезон, згадваюць раптам пра ўсе свае балячкі.

Неяк сяджу ў чаканні сваёй чаргі да ўчастковага тэрапеўта. Побач — дзве жанчыны гадоў пад семдзесят. Схіліўшыся, як бы шэпчучы адна адной на вуха, пра нешта размаўляюць. І раптам адна з іх заўважае каля доктара яшчэ адну жанчыну. І застракатала, як тая сарока:

— Вой, Адамаўна, колькі мы гэта не бачыліся. Бадай, з вясны. Я ж тут ужо з тыдзень тарчу. А цябе ўсё не відаць. Грэшнай справай падумала, мо захварэла ці, крый божа, яшчэ што. Як ты мяне ўзрадавала, што прыйшла. Сядай, зараз пасунемся, — і яна ад такой неспадзяванай сустрэчы аж засвяцілася ўся. Нібыта забылася нават, чаго сядзіць тут, пад дзвярыма доктаркі.

ЛАЯНКА — НЕ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Ніколі не бачыў, каб бацькі калі лаяліся. Хоць, вядома ж, у жыцці ўсялякае здаралася. І без лаянак наўрад ці абыходзілася. Аднак маці з татам ніколі не дапускалі, каб сведкамі гэтага былі мы, дзеці.

Неаднойчы ж здаралася: ускочым мы з вуліцы ў хату і бачым, што бацькі моўчкі стаяць паводдаль адзін насупраць аднаго. Адначасова зірнуць на нас, бы ў нечым правініліся, а потым бацька, звычайна першым парушаючы зацягнутую паўзу, хутчэй нам, чым маці, скажа, кіўнуўшы на дзверы:

— Пайду карове сена крыху з сенніка ўкіну.

Або:

— Пайду пагляджу, ці паелі свінні.

Гэтае бацькава «пайду» было як выйсце з тупіковага становішча, калі пры дзецях ні лаяцца больш не маглі, ні маўчаць. Праўда, «расшыфраваць» падобную сітуацыю я змог нашмат пазней, калі сам стаў дарослы. Ды вось адно думаю: а ці заўсёды нам з жонкай хапала такой мудрасці, як некалі нашым бацькам?

АРЫЕНЦІР — СЛЯДЫ

Летам у вёсцы цяжка вызначыць, жылы той ці іншы дом або не. Шмат якія з іх сёння ўжо гарадскія дзеці і ўнукі вяскоўцаў прыстасавалі пад лецішчы: нешта садзяць ды сеюць на агародах, бавяць час на выхадныя.

А вось зімой — іншая справа. Асабліва калі ідзеш па вясковых вуліцах раніцой пасля снегападу ўначы. Калі ад двара няма слядоў, так і ведай: дом гэты нежылы. І такіх дамоў у маёй Патапаўцы, на жаль, не адзін дзясятак.

МАГІЛЬНЫ БІЗНЕС

Калі ў вёсцы хто памрэ, адразу беглі па Паўлюка і Віцьку. Яны ўжо тут штатныя далакопы, хай сабе ні ў якім штаце і не лічацца. Так, самі па сабе. Плата з рук у рукі. Без усялякай рэгістрацыі ІП і пералічэння падаткаў. А яшчэ — добрая выпіўка і не менш добрая закуска і ў дзень пахавання нябожчыка, і на дзевяць дзён, і на сорак. А то яшчэ і з сабой сёе-тое загорнуць. А што рабіць: без іх вяскоўцам аніяк, яны ж адзіныя ў вёсцы далакопы. У Паўлюка ж і Віцькі гэта адзіны заробак.

Таму і радуюцца мужыкі, калі хто памірае. І наадварот: вельмі засмучаюцца, калі гэтага доўга не здараецца.

Часам можна назіраць такую карціну. Паўлюк або Віцька, прачнуўшыся на досвітку (гэта ўжо хто раней прачнецца), грукаецца да кампаньёна па магільным бізнесе і, пачуўшы голас таго, пытаецца:

— Не чуў, ніхто за ноч не памёр? — І, пачуўшы адмоўны адказ, засмучана махае рукой. — Вось бяда, зноў будзем не пітыя і не етыя...

ЗВАНОК З МОГІЛАК

На Радаўніцу не атрымалася паехаць на радзіму.

Каля абеду тэлефануе аднакласніца Тамара.

— Ты дзе?

— Дома, — адказваю.

— Дзе дома?

— У Мінску.

— А я цябе шукаю на могілках.

— Ды рана мне там яшчэ быць, — аджартоўваюся.

— А калі будзеш? — не разумее жарту Тамара.

— Не ведаю.

— Ну, не сёння?

— Не, не сёння.

— Тады не буду чакаць. Пайду.

— Не чакай, Тамара, ідзі.

І весела, і сумна адначасова.

«ЗЭКавычкі» і «ЗЭКавычкі-2» змешчаны, адпаведна, у нумарах ад 29 жніўня 2014 г. і ад 14 студзеня 2015 г.

Млын навін

✓ «Дзень Буквара» з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, прысвечаны факсімільнаму ўзнаўленню першай беларускай кнігі для навучання грамаце, прайшоў у «Музеі-фабрыцы ёлачных цацак», які знаходзіцца ў гандлёвым цэнтры «Галерэя-Мінск». Галоўная кніжніца краіны падрыхтавала сапраўднае свята для навучэнцаў гімназіі № 1 г. Слуцка, Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў і сталічнай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны. Госці змаглі наведаць выстаўку «Займальнае падарожжа па старонках букваро́ў розных часоў», дзе было прадстаўлена каля 30 букваро́ў і выданняў для пачатковага навучання чытанню і грамаце. Сярод іх — факсімільныя выданні і арыгіналы кніг XVI—XXI стагоддзяў. Цэнтральным экспанатам стаў юбіляр гэтага года — 400-гадовы «Букварь языка славенска писаний чтения учитися хотящим в полезное руковожение». Такім чынам, наведвальнікі выстаўкі змаглі пазнаёміцца з факсіміле кнігі, якая пачала новую сусветную традыцыю. А для дзяцей Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі падрыхтаваў тэматычныя заняткі. У творчай атмасферы хлопчыкі і дзяўчынкі даведаліся, як навучаліся грамаце ў старажытнасці, і паспрабавалі пісаць на… васковых таблічках.

✓ У пару зімовага чараўніцтва здаецца, што казка чакае нас усюды: у крышталёвай далікатнасці сняжынак, духмянай гарбаце і, зразумела, на старонках кніг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь аб'яўляе новы кнігаабмен, каб сабраць пабольш чарадзейства на палічках казачнага зімовага буккросінгу, які будзе праводзіцца з 5 снежня па 15 студзеня. Гэтым разам у госці запрашаюцца казкі. Арганізатары акцыі вельмі спадзяюцца, што нагадаюць усім пра тое, што, нягледзячы на самыя нечаканыя павароты і складаныя жыццёвыя выпрабаванні, усё будзе добра! У падзяку ўсім удзельнікам казачнага буккросінгу музей прапануе бясплатнае наведванне асноўнай экспазіцыі музея. Кнігі казак можна прыносіць у кабінет № 20 у любы дзень акрамя 1 студзеня.

✓ У Чавускім раёне з маленства імкнуцца прывіць дзецям любоў да роднай мовы, народных традыцый і звычаяў. У Гарбавіцкім вучэбна-педагагічным комплексе дзіцячы сад — сярэдняя школа ладзілася метадычнае мерапрыемства для выхавальнікаў дзіцячых садкоў, якія змаглі прадэманстраваць магчымасці выкарыстання «беларускай хаткі» ў фарміраванні ўяўлення дзяцей пра побыт беларусаў, народнае мастацтва, старадаўнія промыслы. Дзеці з задавальненнем калыхалі ляльку ў калысцы, «збівалі масла» ў маслабойцы, круцілі калаўрот, агучвалі прыказкі і прымаўкі, успаміналі каляндарна-абрадавыя святы, гулялі ў народную гульню «Гарлачык», танчылі. Вось так, праз вывучэнне фальклору, фарміруецца ў вучняў разуменне нацыянальных асаблівасцяў культуры беларусаў, зазначае член СПБ Мікалай Салаўцоў, які разам з паэтам Валянцінам Крыжэвічам не раз бываў у гэтай школе.

✓ Літаратурна-музычную імпрэзу «Чароўная кветка беларускай паэзіі», прысвечаную 70-годдзю з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц, зладзілі ў Брылёўскім сельскім Доме культуры Магілёўскага раёна. Як паведаміла бібліятэкар Юлія Яцкова, удзельнікі імпрэзы даведаліся пра жыццёвы шлях і творчую непаўторнасць «палескай ластаўкі», якая легкакрыла ўляцела ў беларускую паэзію і пакінула пасля сябе цудоўныя радкі і непарушную памяць. Змястоўным дадаткам да сказанага стаў прагляд дакументальнага фільма Беларускага тэлебачання «Непрыручаная птушка. Творчы лёс Яўгеніі Янішчыц». Дырэктар Брылёўскага СДК, кампазітар Мікалай Яцкоў распавёў пра музычнасць паэзіі знакамітай паэтэсы і прадставіў свой зборнік «Якая я...», куды ўвайшлі песні на яе вершы. У выкананні Алы і Мікалая Яцковых прагучалі кампазіцыі з гэтага зборніка.

Падрыхтавала Міра ІЎКОВІЧ

Паэт, які раздражняў панурых

Беларускія паэты-эмігранты, апанаваныя настальгічнай смутнагляднасцю, зазвычай мала ўвагі надзялялі фармальнаму боку сваіх вершаў. Калі чытаць іх творы, не ведаючы, хто напісаў, то ў пераважнай большасці можна падумаць, што гартаеш тэксты якога нашаніўца альбо заходнебеларускага паэта (скажам, Міхася Машары ці Міхася Васілька).

Для паэтаў-эмігрантаў (зноў жа, гаворым пра пераважную большасць) галоўнае — не як прамаўляць, а што. І ў гэтым прамоўленым каштоўная не адметная арыгінальная думка, а ўсімі зразумелая эмоцыя смутку, жальбы, словам — усяго таго, чым была багатая, напрыклад, ранняя паэзія Якуба Коласа. Паэты-эмігранты — як сляпыя кацяняты, адарваныя ад маці (Беларусі). Яны плачуць, енчаць, шкадуюць сябе і не здольныя ўбачыць ва ўсёй сваёй выразнасці таго кантэксту, куды трапілі. Яны плачуць па мінулым і не бачаць хараства Тэхаса альбо возера Антарыа, Нью-Ёрка ці Лос-Анджэлеса.

Рыгор Крушына — пісьменнік, які яскрава вылучаўся сярод падобных творцаў.

Ён не хацеў быць сляпым.

Ён быў адкрыты да новых літаратурных стыляў і плыняў.

Любіў гуляць са словам і гукам.

Лічыў, што праўдзівая драматургія верша палягае не ў змесце (у гэтым сэнсе ён не быў паслядоўнікам Багушэвіча), а ў форме.

Эстэтычнай адрознасцю ён раздражняў сваіх калег.

Нават такі цудоўны і па-мастацку багаты, шматгранны пісьменнік, як Масей Сяднёў, выказваўся пра Крушыну дастаткова крытычна і катэгарычна. Паводле Сяднёва, у аснове любога твора павінна быць абавязкова вялікая ідэя, моцны, глыбокі змест, рэалістычная аснова, а не такая паліндрамічная «бяссэнсіца» Рыгора Крушыны:

Горад. Там шмат дарог.
Гонар. Атара ног.
Маса. А сам
Я аматар. Трата мая —

Сачу час.
І марамі
Я сунуся:
Я — і лаза і азалія.

Паводле Сяднёва, перад намі — пустая фарматворчасць, на якую не варта марнаваць час. І Рыгор Крушына быў для яго такім вось паэтам, што збольшага нагадвае спрытнага штукара, а не творцу.

Няўжо сапраўдны паэт Сяднёў не адчуваў хараства паэзіі Крушыны? Няўжо яго не зачароўвалі вірліва-рытмічныя радкі: «Вуліца вяліцца. / Дым і дамы. / Вуліца пыліцца. / Вузліць вугламі...» альбо: «Жужаль-жук жыццё нагамі вяжа / На пажоўклай жаласнай траве...»

Няўжо Сяднёва не ўразіў гэты сапраўдны шэдэўр, прысвечаны літары «У»?

Літара «У», чаму
Стаіш на адной назе,
Падняўшы рукі ўгару?
Воўчым выццём грызе
Восеньскую пару
Доўгае:
— У-у-у!

Сумны, тужлівы гук.
Роспач паднятых рук.
І я далоні ўзніму,
Трымцеючы:
— У-у-у.
Усявышні, чаму
Ў мове так поўна «у»?

Чуюцца ў словах сум,
Смутак, пакута, глум.
Гулка гудзе струна:
Скруха, згуба, труна…
А ёсць і сузорны рух —
Музыка, мудрасць, дух.

Сяднёў быў катэгарычны ў сваім непрыняцці творчасці Рыгора Крушыны. З такой жа катэгарычнасцю Янка Брыль, дарэчы, не прымаў прозу таго ж Масея Сяднёва і раіў яму заставацца адно толькі паэтам.

І ў тым, і ў гэтым выпадку асноўная прычына непрыняцця палягала, думаецца, у... творчай зайздрасці.

Янка Брыль, калі чытаў творча-свабодныя раманы Сяднёва, прысвечаныя Другой сусветнай вайне, разумеў, што сам так не напіша, бо здратавана-стрыножаны савецкай цэнзурай і, што самае важнае, самацэнзурай.

Сяднёву ж, гэтаму духоўнаму вучню Міхася Зарэцкага, была непадуладная тая ажурная бессюжэтная лёгкасць і гульнёвасць, што была ўласцівая Рыгору Крушыну. Сяднёў не разумеў, як можа творчасць быць пазбаўлена трагічнага надрыву, як можна жыць, не нагадваючы сабе і кожнаму пра той страх і боль, які перажылі эмігранты падчас сталінскіх лагераў, акупацыі.

Сяднёў не ўмеў быць ажурна-лёгкім, не ведаў, як можна складаць вонкава-бесклапотныя, гукавобразныя вершы.

А калі чагосьці не ўмееш, а твой сусед гэта робіць цудоўна, то часам падобнае раздражняе і злуе.

Рыгор Крушына адзіны сярод сваіх калегаў, хто меў па-сапраўднаму сонечнае ўспрыманне рэчаіснасці.

Усімі сіламі герой нашага артыкула імкнуўся вырвацца з жахлівых успамінаў юнацтва (Сяднёў — наадварот: з мазахічнай зацятасцю рабіў іх адной з асноўных тэм свайго мастацтва. Нават адну з паэм прысвяціў… забойцу маці).

Гэтае, чыста галівудскае, імкненне да шчаслівага фіналу выразна праглядаецца нават у такім востраэкспрэсіўным, вонкава трагічным цытаваным тут вершы, прысвечаным літары «У».

Не трэба засмучаць чытачоў уласнымі пакутамі, фобіямі, страхамі, няўпэўненасцямі. Наадварот: сапраўдны паэт павінен дэманстраваць унутраную класіцыстычную сілу, спакой і… радасць. А таму, калі ў іншых творцаў мы знаходзім кіламетры таленавітых і не вельмі вершаў пра нешчаслівае каханне, калі яны з дзіўнай, крыху вычварэнскай, радасцю дэманструюць сябе ва ўласнай паэзіі няўдачнікамі, што ссушэлі ад смутку па далёкай радзіме, якіх кідаюць дзяўчаты і нікому яны, па сутнасці, не патрэбны, то ў Рыгора Крушыны ўсё цалкам іначай.

З іранічным спакоем і кінематаграфічнай упэўненасцю ён раіць:

Праменнем ясным рання
Старое гора спляж.
Ручнік для абцірання
Бяры з сабой на пляж.

Ты акуніся ў моры
І акунём плыві.
Пачуеш смех прасторы
І ў целе смех крыві...

А калі зусім пачне заядаць настальгічная туга, то:

«Не праймайся!» — гаворыць Рыгор Крушына і працягвае сваю выратоўчую думку:

На чужыне туга, як мароз, ахіне, —
Не праймайся, чакай
на адлігу.
Прыгадай, мая любая,
сёння мяне.
Талісманам прызнай
маю кнігу.

Хай напеўнае слова
развее тугу
І прагоніць штодзённую
стому.
Я сагрэю цябе. Я завочна
магу…
На самоту не жалься
нікому.

Глядзі на свет з іранічна-стрыманай усмешкай і не паказвай, якія войны д'яблаў і анёлаў дзеюцца ў тваёй душы, не гэта павінна быць асновай творчасці, быў перакананы Рыгор Крушына. І падобная перакананасць, падобная ўнутраная сіла і незалежнасць, безумоўна, раздражняла. Паэты, выхаваныя на лжывай догме, узятай яшчэ ў Дастаеўскага, што мастацтва і пакута — рэчы тоесныя, што трэба дзеля большай вастрыні і выразнасці раздзіраць уласнымі пазногцямі сваю душу да крыві, каб перапэцкаць у ёй і сябе, і чытача, не маглі дараваць Рыгору Крушыну яго падобнага адступніцтва і вялікай унутранай моцы.

Ён адзін з першых сярод паэтаў-эмігрантаў не захацеў быць пакутнікам, патанаць у мінулым.

Замест таго, каб чарговы раз вяртацца да родных кінутых, ніколі больш не ўбачаных «сястрычак-бярозак», ці не лепей, паводле Крушыны, назіраць, як

Маладая андалузка
Выйшла ў скокі. Любата!
Свету цесна, колу вузка —
Танчыць танец жывата…

Андалузка спрытна лучыць
Смех з мастацкаю гульнёй.
Аж натоўп гатоў заюрчыць
І пусціцца ў скокі з ёй.

Вось і паэт, сапраўдны паэт, паводле Рыгора Крушыны, бы тая вясёлая танцорка, мусіць зачараваць, здзівіць, развесяліць, натхніць свайго чытача, каб той адчуў сябе хоць на кароткі час бы ў казцы, каб адарваўся ад прыкрай рэчаіснасці і ўласнага смутнагляддства.

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК

ПАСЕЯНАЕ ЗЕРНЕ ПРАРАСЛО

Калі чую пра чарговую кнігу Сяргея Чыгрына, якая ўбачыла свет у тым ці іншым выдавецтве, кожны раз дзіўлюся нястомнасці гэтага рупліўца на ніве краязнаўства і літаратуры. Што ні год — то новае выданне. А іх ужо 55! Нядаўна творца адзначыў 60-гадовы юбілей. А гэта міжволі прымушае падводзіць вынікі.

Слова Сяргея Чыгрына — паэтычныя зборнікі «Шчырая Шчара», «Горад без цябе», «Лірыка» і «Камень Міндоўга», кнігі гісторыка-краязнаўчых артыкулаў «Янка Купала і Слонімшчына», «Родам са Слонімшчыны», «Па слядах Купалы і Коласа» і інш. Нядаўна ў кнігарнях з'явіўся арыгінальны краязнаўчы «Каляндар Слонімшчыны», укладзены разам з Уладзімірам Хільмановічам.

Улюбёныя тэмы краязнаўчых даследаванняў Сяргея Чыгрына — гісторыя Слонімшчыны, беларуская эміграцыя, літаратурная Беласточчына. Ён апублікаваў сотні артыкулаў з даследаваннямі жыццёвага і творчага шляху Іосіфа Стаброўскага, Тодара Лебяды, Сяргея Хмары, Яна Пятроўскага, Гальяша Леўчыка ды іншых дзеячаў беларускай літаратуры, гісторыі і культуры. Некаторыя з гэтых артыкулаў пабачылі свет у гісторыка-краязнаўчым электронным бюлетэні «Слонімскі край», які Сяргей Чыгрын выдае разам з Сяргеем Яршом з лютага 2016 года. Ужо выйшаў 31 нумар бюлетэня.

Акрамя ўласных краязнаўчых даследаванняў, Сяргей Чыгрын рэгулярна звяртаецца да спадчыны забытых літаратараў. Уклаў і выдаў літаратурную спадчыну С. Грынкевіча, Ф. Грышкевіча, У. Казлоўшчыка, гістарычныя нарысы Міколы Шкялёнка, Сяргея Хмары, Леаніда Трубача… Пісьменнікам, чые кнігі выйшлі з друку ў Беларусі і на Беласточчыне, даследчык прысвяціў не адзін дзясятак артыкулаў, вярнуўшы ў літаратурны ўжытак не адно імя. Да таго ж С. Чыгрын рэгулярна выдае разнастайныя паштоўкі, буклеты, плакаты, прысвечаныя гісторыі і культуры Беларусі.

Асобны пласт і плён яго дзейнасці — пераклады твораў з сусветнай літаратурнай спадчыны на беларускую мову, папулярызацыя чытання замежнай літаратуры па-беларуску. З імёнаў паэтаў, чые творы перакладаў С. Чыгрын, можна згадаць Поля Элюара, Луізу Мішэль, Эжэна Пацье, Поля Верлена, Гіёма Апалінэра, украінскіх паэтаў Рыгора Елішэвіча, Валерыя Бойчанкі, Любоў Пшанічную, турэцкага паэта Фазыла Хюсню Дагларджы. Таксама ім перакладзены на беларускую мову п'есы А. Хайта, К. Манье, Э. Успенскага, К. Гальдоні, А. Астроўскага і іншых драматургаў. Многія спектаклі па іх п'есах пастаўлены на сцэне Слонімскага драматычнага тэатра, дзе Сяргей Мікалаевіч загадвае літаратурнай часткай, і на сцэнах іншых тэатраў Беларусі. Сам ён — аўтар некалькіх п'ес для дзяцей: «Падарункі Дзеда Мароза», «Белая мышка» (у суаўтарстве з Аляксеем Якімовічам), «Зачараваная хатка» (у суаўтарстве з Васілём Ткачовым). У 2018 годзе напісаў камедыю для дарослых «Банкамат для пенсіянераў».

Святлана АДАМОВІЧ

Гісторыя на карце

Знакавая падзея для беларускага грамадства — выхад 4-га, заключнага, тома «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі». Прэзентацыя поўнага выдання, аналагаў якога ў краінах СНД няма, адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Выданне мае стаць добрым дапаможнікам у вывучэнні мінуўшчыны і нават спрычыніцца да адкрыццяў.

Чатырхтомны атлас Беларусі — выдатны вынік сумеснай працы вучоных, картографаў і архівістаў больш чым за 10 гадоў. Гэта першае ўнікальнае найбольш поўнае навукова-даведачнае энцыклапедычнае гісторыка-картаграфічнае выданне ў Беларусі, якое падрабязна адлюстроўвае багатую і ў той жа час вельмі няпростую гісторыю беларускага народа. Ініцыятыва стварэння кнігі належыць рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству «Белкартаграфія» Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь. Яго супрацоўнікі і прыклалі асноўныя намаганні, каб выданне пабачыла свет. Да працы далучыліся і спецыялісты Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускага навукова-даследчага цэнтра электроннай дакументацыі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і іншых дзяржаўных органаў і ўстаноў. Мэтай было стварыць найбольш дасканалыя і поўныя карты розных перыядаў. У сувязі з тым, што гістарычна беларуская земля знаходзілася ў складзе тэрыторый іншых дзяржаў, шмат звестак і матэрыялаў пра Беларусь знаходзіцца ў замежных архівах. Іх і вывучалі аўтары выдання, яны ж працавалі і ў беларускіх архівах.

— Работа пачыналася цяжка: узнікалі арганізацыйныя моманты, праблемы з аўтарамі, пытанні па стварэнні самай вялікай карты, а таксама па ўзгадненні карт з навукоўцамі, — распавёў былы старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгій Кузняцоў, які ўзначаліў рэдакцыйную калегію «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі». — Але том быў створаны дзякуючы актыўнай працы спецыялістаў.

На старонках чатырох тамоў можна знайсці больш за 400 самых разнастайных гістарычных карт, а таксама іншую ілюстрацыйную і тэкставую інфармацыю. Увогуле кніга шырокатэматычная і прысвечана ваенна-палітычным з'явам і падзеям, адміністрацыйным пераўтварэнням, сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму развіццю, духоўнаму становішчу грамадства.

— Аўтары трапна сабралі ў адным творы карты, многія з якіх убачылі свет упершыню. Поўна, без белых плям, адлюстроўваецца багатая гісторыя нашай краіны ад старажытнасці да нашых дзён і паказана месца беларусаў сярод еўрапейскіх народаў, — адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў. — Насамрэч, калі перагортваеш старонкі атласа, глыбей акунаешся ў той загадкавы свет, складзены з мноства падзей і нечаканых адкрыццяў, мільёнаў найцікавейшых, але часта трагічных лёсаў нашых продкаў. Упэўнены, што гэта выданне будзе актуальным і запатрабаваным жыхарамі нашай краіны і не толькі не адзін дзясятак гадоў.

Першы том выйшаў у 2009 годзе. Ён ахоплівае перыяд ад з'яўлення першага чалавека на тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны XVI стагоддзя. Укладальнікі падкрэсліваюць, што ў сувязі з новымі знаходкамі з-пад Іванава Брэсцкай вобласці ёсць падставы гаварыць аб магчымым з'яўленні людзей на тэрыторыі Беларусі прыкладна 250 тысяч гадоў назад. 2012 год — дата выдання другога тома, які адлюстроўвае перыяд амаль 200 гадоў — час, калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Рэчы Паспалітай, то-бок ад Люблінскай уніі да распаду дзяржавы. Упершыню ў айчыннай картаграфіі паказаны ход паўстання



1794 года пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Трэці том выйшаў у 2015 годзе і характарызуе жыццё на тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Падкрэсліваецца, што вельмі няпроста ішла работа над картай, якая адлюстроўвала зямельную ўласнасць беларусаў, а менавіта пераразмеркаванне ўласнікаў зямельных угоддзяў. У выніку была створана ўнікальная карта, якая паказала, што найбольшая колькасць канфіскацый адбывалася ў першым дзесяцігоддзі, а менавіта пасля далучэння да Расійскай імперыі зямель Віцебшчыны і Магілёўшчыны. У чацвёрты том, што прысвечаны перыяду з 1917 года да нашых дзён, увайшла незвычайная карта, на якую ўпершыню нанесены ўсе назвы вёсак, спаленых нямецкімі акупантамі.

Кожны том суправаджаецца генеральнымі картамі, дзе паказаны больш-менш значныя паселішчы таго ці іншага часу з пазначэннем прыналежнасці. Геаграфічны паказальнік дапаможа пазнаёміцца з гістарычнымі і сучаснымі назвамі ўсіх населеных пунктаў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

СКІНУЦЬ «ЗАЛІШНІ ТЛУШЧ»

Для загалоўка пазычым выраз з ліста Уладзіміра Караткевіча да Максіма Танка: «Як выйграюць вершы ад добрай абробкі, быццам чалавек, які скінуў залішні тлушч і зараз зграбны і стройны».

Спатканне з плеаназмам (ад грэч. *pleonasmos* — лішак) у надрукаваных творах, па-першае, сведчыць пра стылістычны недахоп тэксту і, па-другое, характарызуе аўтара як чалавека, які па сёння не разумее імклівасці жыцця, не шкадуе чытачоўскага часу. Падобныя хібы трэба ўмець «вывуджваць».

Пакарыстаемся тлумачальным слоўнікам і пакажам, як плеаназмы засмечваюць тэксты і чаму ад іх трэба пазбаўляцца.

Чытаем: «Дык вось, калега па працы прымала сяброўку ў госці». Калега — 'таварыш па прафесіі, па працы, па вучобе', і па тэксце ўжо зразумела, вучыцца гераіня твора ці працуе. Напрыклад, у рамане Андрэя Федарэнкі вядома, што размова ідзе пра ўрачоў: «Маладзейшыя, спрытнейшыя калегі ўмомант скемілі...».

Частая памылка — выкарыстанне пасля наймення месяца яшчэ і слова «месяц»: «Большасць дэпутатаў з гэтым пагадзілася, і ў чэрвені месяцы першая такая паездка адбылася». Чэрвень — 'шосты месяц каляндарнага года', значыць, слова «месяц» — збыткоўнае. Абышоўся ж без яго Якуб Колас: «Але раз уночы, у другой палавіне красавіка, у разгар белапольскага наступу і трыумфавання паноў, раптам начное цёмнае неба афарбавалася чырвоным грозным бляскам». Цалкам магчыма, што Янку Маўру і трэба было напісаць: «Халодны асенні дождж пырскае бесперапынку, хоць стаіць лета — снежань месяц», каб падлеткі сарыентаваліся ў паравінах года экзатычнай краіны. Але амаль заўсёды сказы са словам «месяц» і яго найменнем — з «залішнім тлушчам».

«Людміла Фёдараўна не прапускае ніводнай сустрэчы з пісьменнікамі, якія адбываюцца ў райцэнтры. І кожны раз прывозіць кнігу з аўтарскім аўтографам». Чытаеш такі сказ і думаеш: аўтограф можа быць «не аўтарскі»? Бо аўтограф — 'уласнаручны, звычайна памятны, надпіс ці подпіс'. Натуральна, перадапошняе слова — лішняе.

Вось аўтар апісвае юбілейную ўрачыстасць: «У кожным выступленні — шчырыя сяброўскія зычэнні. А яшчэ — сувеніры, як кажуць, з унутраным сэнсам. На памяць». Але ж сувенір — 'памятны падарунак', г. зн. семантыка слова ўтрымлівае ў сабе ўвесь сэнс парцэляванага апошняга сказа. Зусім непатрэбнага.

«Вернісаж выстаўкі — не адзіная падзея ў пасольстве Літвы ў Беларусі», — піша аўтар і не задумваецца над тым, што вернісаж — 'урачыстае адкрыццё мастацкай выстаўкі', што другое слова сказа паўтарае семантыку першага.

А ў гэтым выпадку інтэрв'юер задае пытанне спявачцы: «Калі вы пішаце свае ўласныя песні, то гэта дзеля іншых ці дзеля таго, каб выліць свае эмоцыі?» Але дапытлівы чытач думае: «Няўжо творца можа пісаць "чыесьці" і "чужыя" песні?»

Краіна — часцей за ўсё 'дзяржава'. Няцяжка ўсвядоміць, што краіны існуюць (пакуль) толькі на Зямлі. Таму ў сказе: «Падобная сітуацыя з'яўляецца, па сутнасці, агульнай для ўсіх краін свету» — можна без змянення сэнсу ліквідаваць апошняе слова.

Тэксты, асабліва публіцыстычнага стылю, стракацяць выразамі са словам «перспектывы». Перспектывы — 'будучыня, планы, віды на будучае'. У пытальным сказе «Якія ж праблемы і перспектывы на будучыню ў такіх прадпрыемствах?» відавочна «на будучыню» — збыткоўная канструкцыя. Таксама трэба скарачаць пачатак сказа: «Перспектывы далейшага развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Італіі», выкінуўшы «далейшага развіцця». Хапіла ж Івану Шамякіну слова «перспектывы» без ніякіх азначэнняў: «У галаве складаўся план артыкула пра Савіча. І тут жа побач — аб гэтым калгасе, аб яго перспектывах, аб людзях, з якімі сустрэўся за адзін толькі дзень».

А «актуальныя праблемы»? Праблема заўсёды галоўная і сёння актуальная. Няхай будуць актуальнымі «тэмы» ці «пытанні», але ніяк не «праблемы»...

Хочацца часцей сустракацца са «зграбнымі і стройнымі» творамі, без «залішняга тлушчу» — плеаназмаў, якія ніяк не спрыяюць сціслацці і эканомнасці маўлення.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Права на творчы выбух

Яго аматары мастацтва чакаюць заўсёды і незалежна ад «Восеньскіх салонаў». І разумеюць, што ўсё ж не па адной нават вялікай імпрэзе трэба меркаваць пра творчы патэнцыял краіны, пра моладзь, якая яго будзе вызначаць далей, але пакуль толькі вучыцца, напрыклад, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Яе рэктар Міхаіл Баразна распавядае, што значыць акадэмічная адукацыя ў XXI стагоддзі:

— Мы нешта накшталт фабрыкі ці завода. Бо калі ў майстэрні скульптара не ўбачым на падлозе кропляў пластыліну ці гліны, значыць, там нічога не адбываецца. А яшчэ яны рэжуць метал, робяць каркасы, размешваюць гіпс і выкарыстоўваюць розныя сінтэтычныя матэрыялы. І часам у гледача складваецца ўражанне, што мастак ці скульптар — гэта чалавек у берэце. А найчасцей ён з малатком, долатам… Свае ўмовы творча-вытворчыя ёсць у любых відах прафесійнага мастацтва. Я чую рэпетыцыі акцёраў: як выкладваюцца, колькі робяць скачкоў — гэта даволі цяжкая фізічная праца…

— Маладыя людзі, відаць, прыходзяць з рамантычнымі думкамі аб прафесіі. Ці яны гатовыя да таго, што іх чакае?

— Пераважная большасць (незалежна ад абранай спецыяльнасці) гатовая. Магчыма, у кожнага ёсць ружовыя акуляры. Але ў асноўным тыя, хто да нас прыходзіць, разумеюць, што мастацтва — вялікая праца і канкурэнцыя.

Яны пачынаюць гэта адчуваць з прыходам на ўступныя экзамены, а ў жыцці гэта яшчэ больш выразна адбываецца: калі трэба канкурыраваць у конкурсе на рэжысёрскую эксплікацыю ці праект помніка, ці на дызайнерскую распрацоўку. Але творчая сістэма, у адрозненне ад іншых мадэляў (той жа прамысловасці), складвалася стагоддзямі. Колькі жывуць людзі, столькі імкнуцца ўпрыгожваць свет сродкамі прафесійнага мастацтва.

— Назва «акадэмія» сведчыць пра скіраванасць на традыцыю?

— Ёсць традыцыя. Аднак у сённяшнім творчым асяродку ўжо не адчуваецца такога адзінства, як 30—40 гадоў таму. Напачатку нас гэта бянтэжыла. А цяпер ёсць нагода падумаць: магчыма, мала выкарыстоўваем сродкі сувязі інфармацыйнага грамадства. Творчыя асяродкі атрымалі новыя магчымасці для прасоўвання, таму падаецца, што часам канкурэнцыя ідзе не зусім цывілізавана. Ёсць адчуванне, што цяпер творчы асяродак разарваны не паміж відамі мастацтва — пісьменнікамі, мастакамі, музыкантамі, архітэктарамі, — а нават у кожным з іх гэтыя працэсы праяўляюцца.

Гэта назіраецца з сярэдзіны 80-х гадоў: з'яўляюцца творчыя нефармальныя аб'яднанні — россыпам у розных відах мастацтва. А сёння творчыя асяродкі больш актыўна гуртуюцца вакол нейкіх пляцовак — мастацкіх галерэй ці крэатыўных прастор, тэатральных эксперыментальных лабараторый, дзяржаўных ці прыватных арганізацый, скіраваных на новыя формы. Разам яны даюць дынаміку ва ўсёй карціне беларускай мастацкай культуры.

— Ці сутыкаецеся вы як рэктар з пэўнымі формамі творчага бунтарства?

— Заўсёды была прага да бунтарства ці эксперыменту, часам больш радыкальнага, чым мастацтва традыцыйных формаў выказвання. Гэтаму спрыяе і тое, што час моцна змяніўся. Калі раней, у 70-я гады, як расказвалі старэйшыя калегі, студэнты з асцярогай гарталі альбом Сальвадора Далі, то цяпер на лекцыях можна слухаць пра Герхарда Рыхтэра ці пра самыя радыкальныя кінапошукі, гэта стала часткай вучэбных праграм. Калісьці быў закрыты свет заходнееўрапейскай ды паўночнаамерыканскай мастацкай практыкі, сёння выкладчыкі пра гэта распавядаюць свабодна. І трэба на адзнаку здаць экзамен пра тое, за што калісьці можна было пацярпець.

Цяпер студэнты шмат ездзяць, валодаюць мовамі, вольна кантактуюць са сваімі аднагодкамі з-за мяжы. Часам глядзіш па сацыяльных сетках, дык яны за лета аб'язджаюць некалькі краін, глядзяць музейныя зборы, выстаўкі сучаснага мастацтва. Таму цяпер наўрад ці варта выказваць заўвагі, што нашы студэнты чагосьці не ведаюць. Але людзі, што сюды прыходзяць, маюць павагу да традыцый і жаданне развіваць мастацкую школу, а не руйнаваць. Хтосьці займаецца інсталяцыяй, хтосьці — акадэмічным жывапісам альбо графікай, але ў сваім стаўленні да мастацтва Беларусі яны патрыёты.

Упэўнены, што асноўныя акадэмічныя прынцыпы, школы і абавязковыя патрабаванні не могуць нанесці шкоду сённяшняй мастацкай практыцы. Я не бачу ў студэнтаў адмаўлення ад цікавасці да класічных тэхналогій, тэхнік выяўленчага мастацтва альбо выканальніцкіх.

— Але ж кожнаму творцы хочацца быць адметным?..

— Гэта зразумела, калі мы гаворым у шырокім кантэксце культуры, з пункту гледжання месца ў прафесійным мастацтве ўвогуле. Бо каб быць проста яркім, багемным, шырока знакамітым, нават на міжнародным узроўні, неабавязкова вучыцца ў акадэміі. Можна здабыць славу перформера, але калі паглядзець біяграфіі перформераў, нават беларускіх, то можна адзначыць у іх добрую падрыхтоўку, і калі хто сам не вучыўся ў акадэміі, то побач з імі знаходзіліся тыя, хто вучыўся. Як калісьці ўзнік феномен Парыжскай школы? Няўжо так падзейнічаў выключна дух Парыжа?.. Аказалася, што палова мастакоў гэтай плыні вучылася ў малявальнай школе Трутнева ў Вільні, другая — у Кругера ў Мінску, хтосьці — у школе Мурашкі ў Кіеве. Выхаванцы гэтых школ атрымалі адукацыю ў тых, хто меў падрыхтоўку Расійскай акадэміі мастацтва. На пустым месцы нічога не ўзнікае.

Для беларускай культуры вострае пытанне кадраў для рэстаўрацыі. Але раптам яны не з'явяцца. Трэба мець навуковы досвед, быць метадычна падрыхтаваным, адказным. Акрамя таго, чалавек мае дачыненне да скарбу нацыянальнай культуры, які нельга пашкодзіць. І на тое, каб у нас стварылася нацыянальная школа рэстаўрацыі, ёсць усе прычыны. Наша акадэмія мастацтваў з 2008 года рыхтуе мастакоў-рэстаўратараў. Універсітэт культуры і мастацтва — з 2007-га. Мы спецыялізуемся на рухомых аб'ектах алейнага жывапісу, універсітэт мае больш шырокі ахоп, звязаны з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам і іншымі набыткамі культуры. У свеце ўсе рэстаўрацыйныя школы запачаткаваныя пры мастацкіх навучальных установах.

Альбо кіно. Ёсць цяпер фільмы, што здымаюць смартфонам, але ж значная большасць прадукту не можа з'явіцца без удзелу аператараў, асвятляльнікаў, мастакоў. А калі трэба зняць батальныя сцэны з удзелам некалькіх тысяч чалавек? Як без ведаў, досведу, калектыўнай творчасці?.. Могуць запальвацца зоркі на небасхіле сучаснай беларускай культуры. Але ў цэлым рух, актыўная форма існавання ў мастацкай культуры магчымая толькі падрыхтаваным.

— Ці бывае, каб на іспыт прыйшоў самародак, які хоча стаць мастаком?

— Для нас няма розніцы, ці мае абітурыент спецыяльную падрыхтоўку, ці не. Усё зашыфравана пад кодамі, і ў некаторых выяўленчых і візуальных мастацтвах экзаменатары бачаць толькі выніковую работу. Ужо адно заданне па кампазіцыі выяўляе стаўленне да навакольнага свету. Раней было інакш: бачылі гэтага абітурыента падчас працы, глядзелі, як ён аловак чыніць, як усміхаецца, ці агрэсіўны ў сваіх паводзінах. Цяпер гэтай магчымасці няма, і мы часам не ведаем, дзе чалавек атрымаў навыкі: у навучальнай установе ці праз рэпетытарства (што бліжэй да рамесніцтва). Але мы назіраем за імі на працягу навучання. Таму на мастацкім факультэце і на спецыяльнасці «Дызайн» адкрытыя прагляды. Кожны выкладчык у сістэме індывідуальнага навучання ведае, як чалавек стварыў тую ці іншую работу.

— Ці адрозніваюцца студэнты XXI стагоддзя ад тых, што былі ў мінулым?

— Мы не ведаем, якія будуць студэнты праз год ці два. Я сутыкаўся са зломамі пакаленняў, што прыводзіла да нечаканых вынікаў, нават у тыя часы, калі быў студэнтам. Цяпер сярэдні ўзровень абітурыентаў значна знізіўся. Гэта паўплывала і на атмасферу студэнцкага бытавання. Я паступіў пасля школы і быў самы малодшы ў групе. У нас былі людзі, якія мелі дзяцей, вучыліся ў іншых ВНУ, прайшлі праз службу ў войску, былі больш дасведчаныя. І наша сталенне побач з імі ішло больш хутка. Сённяшнія студэнты — гэта ўчарашнія выпускнікі сярэднеспецыяльных устаноў альбо школ. А старэйшыя больш ідуць на завочнае. Раней у гендарным плане была больш-менш збалансаваная сітуацыя. Цяпер такое адчуванне, што пераважваюць жанчыны. Але ж мы не можам на гэта ўплываць: у нас роўныя правы. А дзяўчаты больш актыўныя, больш арганізаваныя. Гэта таксама ўплывае на агульную атмасферу. На скульптуры, памятаю, хлопцы пераносілі дзяўчатам работы на стэлажы (па паўтара дзясятка кілаграм). А цяпер можа быць курс з адных дзяўчат… Таму сама атмасфера ўжо крыху іншая.

Цяпер у нас каля 1300 студэнтаў (з завочнікамі, магістрантамі). Ёсць замежныя студэнты: грамадзяне ЗША, Кітая, расіяне, датчане… У большай ступені вабіць школа выяўленчага мастацтва, графікі, спецыяльнасць мастакоў кіно, тэатра, дызайн. На тэатральным факультэце вучыцца студэнт з Японіі. Былі шведы, нарвежцы, грэкі, палякі, літоўцы, калі глядзець за апошнія 15 гадоў.

На ўсе новыя выклікі мы рэагуем эвалюцыйна. Дзякуючы таму, што творчы асяродак сам па сабе дыскусійны, у выніку адбываецца эвалюцыя. Ёсць старэйшае пакаленне — як грунт. Ёсць сярэдняе пакаленне, якое робіць крок, добра падумаўшы. Моладзь схільная да эксперымента. Гэта дазваляе захоўваць традыцыі акадэміі.

— Куды ідзе працаваць спецыяліст з прафесіяй мастака?

— Гісторыя ведае самыя розныя прыклады. Нават нашы прафесары распавядаюць, што былі размеркаваныя і вялі нейкую студыю пры ЖЭСе. Але яна была для

Фота Сяргея Жанновіча.

іх творчай майстэрняй, каб набрацца досведу і фінансавай стабільнасці. Цяпер ідуць працаваць і ў сярэднія навучальныя ўстановы, каледжы мастацтваў, вядуць студыі, працуюць у выдавецтвах, на прадпрыемствах творчых саюзаў. Творчая асоба знойдзе сябе ў гэтым свеце. У нас стапрацэнтнае размеркаванне, і пераважная большасць выпускнікоў атрымлівае першае працоўнае месца.

— Ці бывае, што на працягу вучобы губляецца творчы інтарэс?

— Я ў гэтай установе працую ўжо 26 гадоў, плюс студэнцтва. Ведаю, што бывае ўсё. Камусьці лёгка, у кагосьці ўзнікаюць праблемы. І сем'і складаюцца, і трагедыі бываюць, і расчараванні. Усе людзі з тонкімі эмоцыямі. Не кожны дасягае творчага піку падчас вучобы, гэта датычыцца любой спецыяльнасці. Але кожны мае права на творчы выбух і ў 40, і ў 50 гадоў. Хтосьці пасярод навучання можа змяніць кірунак. Яркі прыклад — Фёдар Шурмялёў, які вучыўся на бюджэце па спецыяльнасці «Графічны дызайн», а перавёўся на платнае навучанне па станковай графіцы. Згубіў 2—3 гады, а сёння мы маем вынік: і міжнародныя ўзнагароды, і вядомасць у творчым асяродку. Мы яго запрасілі на працу, ён скончыў магістратуру, цяпер майстар друкарскай графікі.

— Творчым спецыяльнасцям традыцыйна навучалі майстры. А вы і моладзь запрашаеце выкладаць.

— Мы на гэта ішлі свядома. Лічу, што менавіта кантрасныя ўзроставыя адносіны дапамаглі акадэміі лёгка выйсці з крызіснага перыяду канца 80—90-х гадоў. Памятаю, як, нягледзячы на розніцу ва ўзросце, меў сяброўскія адносіны з народным мастаком Анатолем Бараноўскім. Акадэміі гэта было ўласціва: не памятаю праблем пакаленняў. Усе паважалі Вашчанку, Анікейчыка ці Раманюка. Было адчуванне сям'і. І сёння мы гэтую традыцыю захоўваем і прапаноўваем самым таленавітым студэнтам пайсці ў магістратуру, аспірантуру, працаваць як Алеся Скарабагатая, Вольга Мельнік (Малахава), Ганна Конанава — ужо дэкан, самы малады за ўсю гісторыю мастацкага факультэта.

Сюды цягнуцца многія — не па зарплату. А па магчымасці кантактаваць і са старэйшымі, і са студэнтамі. Таму акадэмія — носьбіт як традыцыі, так і эксперыменту, жадання быць дынамічным асяродкам, імкнення адпавядаць сённяшняй Беларусі.

Зразумела, праблемы ёсць, як у існаванні любой інстытуцыі, але і дасягненні таксама. Іх апошнім часам вельмі многа. Прыклад даюць маладыя выкладчыкі, як скульптар Канстанцін Касцючэнка, адзін з аўтараў помніка «Вароты памяці». Студэнты-дызайнеры атрымліваюць узнагароды за мяжой, і нават гукарэжысёры (сёлета ўпершыню атрымалі адзнаку ў Італіі).

— Не пераманяць іх ад нас?

— Я ўпэўнены, што калі хто і паехаў працаваць за мяжу, то выпускнік нашай акадэміі заўсёды напіша ў дужках «Беларусь». Апошнія гадоў 8 нашы дасягненні сталі падмуркам перагагічнага працэсу.

— Для творчасці патрэбныя ўмовы: памяшканні, матэрыялы, залы. Некалькі гадоў таму ў акадэміі пачалася рэканструкцыя. Калі рэальна можа будзе сказаць: «Усё зроблена, як мы хацелі»?

— Такога не будзе ніколі. Адзін будынак адрамантавалі, другі — на чарзе. Потым трэці, чацвёрты… Сёння ў старым будынку новыя камунікацыі, новае асвятленне. Тэатральная зала амаль гатовая: крэслы стаяць, лямпы свецяць, але пытанне наконт абсталявання сцэны яшчэ не да канца вырашана. Плануем, як і раней, праводзіць тут студэнцкія спектаклі, капуснікі, якімі славілася акадэмія. Было спаборніцтва факультэтаў у патоку творчай энергіі, і часам мастакі ці дызайнеры выглядалі больш магутна, чым акцёры. І сёння ёсць агульныя акадэмічныя святы, калі выяўляюцца таленты студэнтаў самых розных спецыяльнасцяў. Ёсць мастакі з оперным голасам і падрыхтоўкай (вучыліся ў каледжы імя Ахрэмчыка па вакале, але сталі мастакамі)…

Калі мы ўваходзілі ў рамонт, здавалася, што гэта бясконца, а сёння ў нас зусім іншы настрой. Гэты працэс ідзе дзякуючы падтрымцы дзяржавы: Мастацкая школа вельмі патрэбна грамадству.

Ларыса ЦІМОШЫК

«ПАЛЯВАННЕ НА СЯБЕ»: СТРЭЛ УХАЛАСТУЮ?

«Сюды мы больш не пойдзем!.. Ерась нейкую паказваюць, а акцёрам яшчэ хочацца ў гэтым граць», — разгневаныя жанчыны сталага веку з усёй хуткасцю, на якую яны былі здатныя, збягалі з тэатра падчас антракту. Фарсавы, гэгавы спектакль «Паляванне на сябе» кіеўскага рэжысёра Стаса Жыркова дакладна не для адэптаў класікі. Але ж для каго?

Знакамітая п'еса Аляксандра Вампілава «Паляванне на качак», напісаная ў далёкім 1967 годзе, у версіі Стаса Жыркова максімальна набліжана да сучаснай Беларусі. Зілаў у выкананні Максіма Брагінца атрымаў кватэру ў Новай Баравой, а вольны час любіць бавіць з «сябрамі» ў вядомым мінскім рэстаране «Друзья» (не ведаю, як тут будуць дзякаваць тэатру за такую ўдалую рэкламу). Дзеянне набліжана да нас не толькі ў геаграфічным, але ж і ў сацыяльным кантэксце. Зілаў выглядае тыповым менеджарам сярэдняга звяна, які працуе ў тыповай фірме, якіх у нас процьма. Яго жонка Галіна (Людміла Сідаркевіч) — таксама вельмі пазнавальны вобраз сярэднестатыстычнай беларускай жанчыны, якая ўсё даруе, трывае і, галоўнае, яшчэ спрабуе направіць свайго мужа-небараку на шлях ісціны. Хоць і павярхоўна, але ж спектакль уздымае і актуальную сёння тэму хатняга гвалту і нават пытанне арэнднага жылля, пра павелічэнне долі якога ідзе гаворка ў Беларусі. Сучаснасць уварвалася ў п'есу Вампілава вельмі ўпэўнена. І зразумела, дзеля каго. Дзеля той самай моладзі, якая прыйдзе на спектакль і пазнае ў яго героях сябе, сяброў, начальнікаў, каханых.

Павінна спадабацца маладой аўдыторыі і рэжысура Стаса Жыркова, які сваім драйвам заахвоціў акцёраў тэатра. Тыя і без Жыркова ўжо прызвычаіліся да нестандартных рэжысёрскіх задач, але ж у гэтым спектаклі «адарваліся» на поўную. Трыа Андрэя Новікава (Саяпін), Дзмітрыя Давідовіча (Дзіма) і Арцёма Курэня (Кузакоў) шыкоўна выканала сваіх карыкатурных герояў. Калі яны ўпершыню з'явіліся на сцэне, падалося, што гэта сядзяць лялькі, а не жывыя людзі. Сяргей Шымко ў ролі Кушака з гумарам і вельмі каларытна паказаў усе магчымыя варыяцыі вобраза начальніка. Але ж акцёрскае майстэрства не выратавала спектакль.

Тое, што адбывалася на сцэне, вельмі нагадвала (вы толькі не здзіўляйцеся!) выступленне знакамітай групы «Ленінград», якая толькі-толькі з аншлагам адгрымела ў «Мінск-Арэне». Алкаголь, жанчыны, эпатаж — дый усё было! Бутэлькі з-пад алкагольных напояў сталі важнай часткай у афармленні сцэны. Героі, здавалася, большы час дзеяння былі нападпітку. Жанчыны ў выкананні Гражыны Быкавай (Ірына), Анастасіі Бабровай (Валерыя) і Ганны Семянякі (Вера) фліртавалі з публікай, адказвалі за эпатаж. А Ганна Семяняка яшчэ і ўдала выконвала песенныя нумары. Канцэрт у тэатры, не менш! Гучны аж да болі ў вушах, яркі да рэзі ў вачах. А недзе ў падсвядомасці ўсё грае песня Шнурава: «Для мяне грошы папера, для цябе свабода. На амерыканскую мару сёння мода»...

Але тое, што вельмі добра зайшло б у «Мінск-Арэне», на сцэне тэатра выклікае здзіўленне і ўздыхі па зале: ну, калі гэта ўжо скончыцца. Вядома, форма спектакля-канцэрта можа быць вельмі пераканальнай. Але «Паляванне на сябе» паспрабавала злучыць у адно цэлае ўсё: атракцыён для гледачоў, канцэрт, бясконцыя жартачкі, беларускія рэаліі і праблемы сучаснага абывацеля, які не ведае, куды накіраваць энергію. Цалкам уключыцца ў такі вінегрэт проста немагчыма. Калі героі пераходзяць ад шумнай вакханаліі да шчырых дыялогаў, у сэрцы нічога не адбіваецца, яно здзіўлена чакае канца. Людміла Сідаркевіч са сваімі сапраўднымі пачуццямі тут вельмі не да месца. Магчыма, ідэя рэжысёра якраз і была ў тым, каб злучыць на сцэне сапраўднае і несапраўднае. На тое ж намякае і сцэнаграфія: сіняе дрэва разрывае кафельную прастору кватэры. Сапраўднае прыгожа ўрываецца ў несапраўднае жыццё. Ці наадварот? Шкада толькі, што гэгі, фарс і гумар перакрываюць тое сапраўднае ў самім спектаклі.

Некаторыя крытыкі прарочаць «Паляванню на сябе» добрую касавую будучыню. Не ўпэўнена ў гэтым. Прыхільнікі класічнага тэатра гнеўна выйдуць пасля антракту, як тое зрабілі згаданыя жанчынкі. Моладзь, якая шукае ў тэатры эксперыменту і вастрыні, будзе крывіць нос ад празмернай атракцыённасці. Тыя, хто чакае ад спектакля вясёлага баўлення часу, таксама будуць расчараваныя. Бо гумар гумарам, але нас шчыра папярэдзілі: гэта не камедыя. Дарэчы, апошнім не час сумаваць: набліжаецца Новы год, а з ім і вялікая колькасць камедый на тэатральнай сцэне і на экранах кінатэатраў. Дый такіх, што можна толькі смяяцца і зусім ужо не думаць.

Паліна ЛІСОЎСКАЯ

Формула форуму

Канец каляндарнага года для тэатраў, як правіла, праходзіць з перадсвяточным настроем і адпаведным напаўненнем афішы, дзе вялікую долю паказаў займаюць казкі. Вялікі тэатр Беларусі ўжо дзевяць гадоў мае праект, які можна назваць казачным — з пункту гледжання адметнасці і маркетынгавага ходу ў прасоўванні спектакляў ды папулярызацыі самога тэатра, які традыцыйна адносяць да высокага мастацтва, пра якое часта кажуць «не для ўсіх». Опера і балет — для ўсіх, даказвае тэатр, прыцягваючы розную публіку шляхам адметных праектаў. Адзін з іх — Мінскі міжнародны Калядны оперны форум.

Яго з'яўленне напачатку было казачным: праз самую магчымасць бачыць выдатных артыстаў і цудоўныя пастаноўкі з розных краін. І вось крыху менш за дзесяцігоддзе тэатру спатрэбілася на тое, каб прыцягваць гледача на форум дзякуючы ўласным пастаноўкам, якія мелі рэзананс і выклікалі цікавасць. І пры гэтым колькасць краін — удзельніц Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму не зменшылася, а, наадварот, павялічылася. Трэба ўмець!..

«Калі мы пачыналі, было ўсяго дзевяць краін. Сёлета ўдзел у мерапрыемствах форуму пацвердзілі 34 краіны, у тым ліку на конкурс вакалістаў паступіла больш за 330 заявак з 26 краін, — патлумачыў генеральны дырэктар Вялікага тэатра Уладзімір Грыдзюшка. — Гэта сведчыць пра вялікі аўтарытэт, які набыў форум, і пра ўвагу сусветнай культурнай грамадскасці, якую ён выклікае».

Сёлета Мінскі міжнародны Калядны форум пройдзе з 13 па 21 снежня. Аматарам варта загадзя паклапаціцца пра квіткі. Таму што форум дазваляе не толькі далучыцца да лепшых пастановак бягучага рэпертуару нашага тэатра, але і ўбачыць у галоўных партыях зорак сусветнай опернай сцэны.

У праграме Каляднага форуму — чатыры оперныя пастаноўкі. На адкрыццё 13 снежня — прэм'ера оперы-буф «Дон Паскуале» Гаэтана Даніцэці. Спектакль, які, паводле галоўнага дырыжора тэатра Віктара Пласкіны, быў зроблены спецыяльна для моладзі (яго ўдзельнікі — учарашнія стажоры Вялікага тэатра, а цяпер яго супрацоўнікі) і павінен стаць «бадзёрым, звонкім, вясёлым і добрым пачаткам, які задасць святочны тон фестывалю».

У праграму ўключаныя дзве вельмі папулярныя оперы Джакома Пучыні «Тоска» і «Багема» (16 і 17 снежня). Пастаноўкі гэтых опер у нашым тэатры ацэненыя гледачамі. Але ў партыі Флорыі Тоскі гэтым вечарам на сцэну выйдзе сербская спявачка Драгана Радакавіч, а ў ролі Каварадосі выступіць уладальнік расійскай тэатральнай прэміі «Залатая маска», заслужаны артыст Расіі і народны артыст Татарстана, прэм'ер Марыінскага тэатра Ахмед Агадзі. Дырыжыраваць будзе маэстра з Італіі Джанлука Марчана. А ў тых, хто яшчэ не паспеў паглядзець самы гучны спектакль мінулага сезона — «Багему» ў пастаноўцы народнага артыста Расіі Аляксандра Цітэля, ёсць магчымасць гэта зрабіць у перадкалядныя дні: памножыць свята праз мастацтва. І прэм'ера ўжо гэтага сезона — «Саламея» Рыхарда Штрауса ў пастаноўцы Міхаіла Панджавідзэ — надасць філасофскага настрою з думкамі пра лёс свету напярэдадні свята Нараджэння Хрыстовага (20 снежня). Так, у гэтай оперы ў якасці госця — расійскі тэнар Дзмітрый П'яноў, які спявае партыю Ірада.

Акрамя спектакляў, паслухаць знакамітых гасцей форуму можна падчас канцэртаў. Сёлета ўпершыню ў Мінску выступіць з сольнай праграмай адна з самых запатрабаваных оперных спявачак Вольга Перацяцька, уладальніца рэдкага каларатурнага сапрана. Канцэрт пройдзе ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Вялікага тэатра Беларусі, але пад кіраўніцтвам дырыжора Джанлукі Марчана. І яшчэ адзін канцэрт — на ўрачыстае закрыццё (21 снежня) з удзелам артыстаў 15 краін. Прыемна, што ў ліку зорак да нас прыязджаюць лаўрэаты Мінскага міжнароднага Каляднага конкурсу вакалістаў папярэдніх гадоў. З імі на адну сцэну выйдуць пераможцы сёлетняга конкурсу. Гэтым вечарам за дырыжорскім пультам будзе народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў.

Дарэчы:

V Мінскі міжнародны Калядны конкурс вакалістаў пройдзе з 14 па 19 снежня.

У спаборніцтве прадугледжаны тры туры: два першыя — пад акампанемент фартэпіяна, трэці (фінальны) адбываецца на галоўнай сцэне, дзе канкурсант у суправаджэнні аркестра выконвае сцэну з оперы (яму дапамагаюць артысты Вялікага тэатра Беларусі).

Прызавы фонд конкурсу складае 28 000 долараў ЗША. Уладальнік Гран-пры згодна з умовамі атрымлівае грашовую ўзнагароду ў памеры 10 000 долараў ЗША. Адзнака за I прэмію складае 8 000, лаўрэат II прэміі атрымае 6 000, а III — 4 000 долараў ЗША адпаведна.

Марыя АСІПЕНКА

У КАРОТКІМ МЕТРЫ

Прыемны паслясмак «Лістапада» — праз нашу кінематаграфічную моладзь

Маладыя парасткі Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» былі паказаны ў тыднёвым марафоне шчодра і разнастайна. У 200 сеансаў на пяці пляцоўках трапілі літаральна ўсе прадстаўнікі нашай краіны, хто на працягу года прыцягнуў да сябе ўвагу. Калі поўнаметражнае ігравое кіно яшчэ не па зубах шматлікім пачаткоўцам, то кароткі метр атрымаўся як заяўка на будучыню. У фокус увагі трапіла моладзь, каб заявіць пра свае погляды і прыхільнасці, паказаць магчымасці.

Гэта свабоднае пакаленне. Яны ўступілі ў жыццё і прафесію ў непадцэнзурны час. Яны не ведаюць ідэалагічных забаронаў. Ім дазваляецца тое, пра што старэйшыя маглі толькі марыць. Адкрытыя вострыя тэмы, шырокі спектр сродкаў выразнасці. Праўда, грошай на тое, каб здымаць кіно, вельмі мала. Аднак сёння гэта можна рабіць амаль без грошай або за вельмі сціплы бюджэт. Было б жаданне.

Кадр з фільма «Ягор».

«Хатняя» радасць артыстаў тэатра імя Янкі Купалы — дзесяціхвілінны ігравы фільм «Ягор» Рамана Падалякі або такі ж дзесяціхвілінны «Вахцёр» артыста Рускага тэатра імя Горкага Андрэя Крывецкага. Тут ёсць запамінальныя асобы і жаданне адлюстраваць свой час.

Наперадзе цягніка ішла ініцыятыва, а зусім не заданне, справаздачнасць за вучобу або прадзюсарскія амбіцыі. Хлопцы здымалі кіно для сябе, а атрымалася і для нас з вамі. Кінатэатр «Беларусь» расшчодрыўся на два моладзевыя альманахі, дзе былі апроч названых чатыры дакументальныя і чатыры ігравыя «кароткія метры». Акрамя звычайных гледачоў іх глядзелі прадстаўнікі здымачных груп, сябры і ўдзельнікі падзей. Залы былі поўныя на гэтым своеасаблівым кірмашы талентаў.

Кадр з фільма «Франка».

Журналісты звычайна пішуць пра фільмы асноўнага конкурсу, пра *vip*-персон, знакамітых гасцей і членаў журы. Да знакамітасцяў будучага фотааб'ектывы не дацягваюцца, ды і ці варта гадаць, у каго творчы лёс складзецца, у каго — не? Асабняком стаяў «Хрусталь» рэжысёра Дар'і Жук. Загадзя шырока разрэкламаваная паўтарыгадзінная стужка з'яўлялася на розных пляцоўках, у розныя дні і адназначна сведчыла, што беларуская дзяўчына, якая пажыла ў Амерыцы, мае вялікі творчы патэнцыял. Больш крытычна ўспрымаўся зборнік дэбютных работ студэнтаў рэжысёра Івана Паўлава. Мастацкі кіраўнік праекта вызначыў ім складаную тэму: «Вайна. Застацца чалавекам». Усе ўдзельнікі альманаха, створанага з дапамогай студыі «Беларусьфільм», прызнаваліся, што дрэнна разабраліся ў тэме. Натуральна, па прычыне маладосці ведаюць вайну па кнігах і расказах і не змаглі знайсці ключ, які б выявіў гэты матэрыял. Паспрыялі дасведчаныя артысты мінскіх тэатраў, якія прымералі на сябе маленечкія ролі і змаглі дапамагчы рэжысёрам-пачаткоўцам. Асабліва добра гэта атрымалася ў навелах М. Сямёнава-Алейнікава «Франка» і І. Васільева «Фота на памяць». Вядомыя акцёры Зінаіда Зубкова, Аляксандр Парфяновіч, Аляксандр Брухацкі, Барыс Барысёнак, Вераніка Пляшкевіч, Ігар Дзянісаў, Георгій Маляўскі сумленна і ўмела дапамагалі рэжысёрам зрабіць ваенныя гісторыі пераканаўчымі, пэўнымі. Зрэшты, пазбегнуць фальшу ў многіх кадрах не ўдалося. Думаю, што ў значнай ступені быў вінаваты драматычны матэрыял. Магчыма, калі б моладзі далі выбраць сваю тэму, вынік быў бы лепшы.

Гэта і адбылося ў альманаху дакументалістаў. Невялікія гісторыі чатырох рэжысёраў развіваліся паступова. «Ціхая вуліца» Аляксандры Маркавай добрая па тэме — незаконны знос прыватных дамоў без тлумачэнняў. Прыхільнасць дзяцей да прыроды і жывёлаў. Прыхільнасць дарослых да зямлі. Усё гэта можна разбурыць у адзін момант. Недахоп фільма — няма адбору матэрыялу. Шмат лішніх дэталяў. Сяміхвіліннае інтэрв'ю «Нежаніх» Алена Ясінская ўмела падала як праблему маладых несамастойных мужчын.

Кадр з фільма «Дай мне знак».

Фільм Кірыла Уласенкі «Дай мне знак» патрыятычны і сацыяльны. Ён распавядае пра пошукава-выратавальны атрад «Анёл». Людзі аб'ядноўваюцца вакол ідэі, свядома і добраахвотна, па ўласным перакананні. Аб'ядноўваюцца, каб шукаць зніклых, якія заблукалі ў лесе. Тых, хто разгубіўся з-за немачы. Шукаюць і знаходзяць. Мабыць, тут была вельмі няпростая работа рэжысёра, якому даводзілася арганізоўваць здымкі ў складаных умовах, выклікаць людзей на шчырасць.

Чацвёрты фільм дакументальнага альманаха амаль іграві. Яго зрабіла Алена Цагельская пра беларускага мастака, які малюе музычныя карціны. Фільм называецца «Аляксандр Забаўчык. Мой джаз». Тут яркая арыгінальная палітра мастака і выдатнае музычнае суправаджэнне выкананыя як імправізацыя. Мова фільма — мова музыкі. У ім шмат назіранняў і разважанняў філасофскага характару. Вельмі спелая, уражлівая работа маладога рэжысёра.

Цяжка даць прагноз пракатнаму лёсу ўсіх вышэйназваных фільмаў. Ці будуць яны цікавыя шараговым гледачам? Зразумела адно: маладыя імкнуцца асэнсаваць свой час без павучальных акцэнтаў. Рэжысёры самі знайшлі тэмы і герояў. Ёсць надзея, што далей іх чакае не кароткі, а поўны кінематаграфічны метр.

Таццяна АРЛОВА

Рабіць гісторыю

Ёсць кінематаграфісты, для якіх гэта зусім не метафарычны выраз. Напрыклад, студыя гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» дапамагае ўзгадніць старонкі беларускай гісторыі праз кіно. Нашы трагедыі і набыткі, героі і асобы, што ўзбагацілі не толькі сваю радзіму, але і наогул чалавечы свет сваімі справамі, — у цэнтры увагі стравальнікаў дакументальных фільмаў, якія часам здаюцца паўнавартаснымі мастацкімі работамі (як па працягласці, так і па падыходзе).

Пасля некаторых з'яўляецца адчуванне моцнага ўзрушэння альбо шоку, а некаторыя натхняюць выдатнымі прыкладамі стаўлення да радзімы ў розныя яе гістарычныя перыяды альбо да справы, якой хацелася прысвяціць жыццё. Як, напрыклад, вучоны-фізік Зыгмунт Урублеўскі, ураджэнец Гродзеншчыны, распрацоўкі якога ў свой час скланулі сусветную навуку. Пра яго распавядае фільм «Зыгмунт Урублеўскі. Гарачы кісларод», які яшчэ можна заспець у кіназалах розных гарадоў Беларусі.

Гэта адна з частак адметнага дакументальнага праекта «100 імёнаў Беларусі», які ўжо прыцягнуў увагу гледачоў. І не толькі з пункту гледжання выбару герояў для фільмаў, але і самім падыходам да здымкаў. Дакументальнае кіно можа быць рознае — публіцыстычнае, дзеля таго, каб раскрыць з'яву і пераканаўча данесці думку праз рэальныя факты, лічбы, дакументы ці сведкаў пэўных драматычных ці трагічных падзей. Але дакументальнае кіно можа дапамагчы адчуць эпоху, яе дух і пытанні, вырашэння якіх вымагала жыццё. І часам дзеля гэтага можна нагадаць пра аднаго чалавека, узнавіць яго біяграфію, каб стварыць вобраз часу і магчымасцяў, якія мелі людзі, альбо насуперак чаканням іх атрымлівалі ці наогул стваралі самі для сябе.

Зыгмунт Урублеўскі жыў насуперак. Нарадзіўшыся ў шляхецкай сям'і ў 1845 годзе, выдатна адукаваны юнак не абмінуў падзей, якія адбываліся ў 1860-я гады на радзіме. Прыняў ідэі паўстанцаў, за што пацярпеў: высылка, хвароба, жыццё пад наглядам паліцыі… Затым пераезд, Еўропа, новыя магчымасці, у тым ліку для заняткаў навукай. І той самы дзень, калі з Кракава прыйшла сенсацыйная навіна: насуперак меркаванням аўтарытэтных навукоўцаў вадкі кісларод ёсць, і яго здолелі атрымаць! А потым можна было пайсці і далей — атрымаць вадкі азот ці вокіс вугляроду і іншыя газы. Цяпер гэтымі вынаходніцтвамі карыстаецца свет — у касманаўтыцы, медыцыне і нават у побыце. Ніхто не задумваецца, якім шляхам атрыманыя выгоды, што за іх, магчыма, нехта ахвяраваў жыццём.

Зыгмунт Урублеўскі здабыў сусветную прызнанасць у навуковых колах, стаў ганаровым членам Кракаўскай акадэміі навук, дэканам фізіка-матэматычнага факультэта Ягелонскага ўніверсітэта. Але не разнявольваўся і працягваў працаваць у лабараторыі. Не было для яго выхадных, вечар быў часткай дня, адзіным часам, што дадзены чалавеку, які хоча паспець шмат, вельмі шмат, ён апантаны справай… Спыніў даследчыка нечаканы пажар у лабараторыі, падчас якога моцна пацярпеў сам Урублеўскі, а праз некаторы час памёр.

Фільмы пра рэальных людзей, заснаваныя на іх узноўленай біяграфіі (створаныя ў жанры дакдрамы), уражваюць менавіта характарамі. Тое, што не прыдумана, часам кранае больш, чым самая жаласлівая штучная меладрама, — ступень пераканаўчасці зусім іншая. А стваральнікі фільмаў з серыі «100 імёнаў Беларусі», як правіла, імкнуцца выбудаваць сюжэт, падаць гісторыю з інтрыгай (каб глядач усё ж адчуваў асаблівасць размовы праз кіно), імкнуцца задаць пытанні. Рэальнасць іх падкідае без сарамлівасці. Што ёсць справа жыцця для чалавека? Ці можна дзеля яе ісці на рызыку? Ці варта ахвяраваць сабой дзеля таго, каб нехта іншы змог адкрываць новыя вяршыні і ішоў далей у спасціжэнні таямніц прыроды і чалавека. І ці не чалавек — самая вялікая таямніца ў гэтым свеце?

Яшчэ адзін адметны бок праекта ў тым, што сутнасныя пытанні, якія датычацца існавання чалавека, агучваюцца праз лёсы нашых землякоў: усё блізка, больш зразумела. І аднаразова больш істотна, бо заснавана на досведзе тых, хто тут жа да нас рабіў нешта, а мы забяспечваем працяг, бесперапыннасць. Серыя дзеля адчування повязі пакаленняў. Нават калі яна (вонкава) здаецца перарванай. Зыгмунта Урублеўскага ў свеце ведаюць як польскага вучонага. Але важна, каб праўду ведалі мы і рабілі высновы, не дапускаючы старт ужо ў нашай рэчаіснасці. Гісторыя ўсё расстаўляе па месцах, але перш чым такія асобы, як Урублеўскі ці Ігнат Дамейка (герой папярэдняга выпуску) альбо Наркевіч Ёдка ці Казімір Семяновіч, прыходзяць да нас праз кіно ў якасці сваіх герояў, адбываецца шмат драматычных падзей, якія народы перажываюць з болем і так ці інакш даводзіцца азірацца, вяртацца думкамі ў мінулае, для таго каб лепш разумець сваю будучыню. Яна павінна быць, калі былі і ёсць тыя, хто «гарыць» справай асветы.

Марыя АСІПЕНКА

Зліццё вобразаў

У малой зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбудзецца канцэрт «Зліццё вобразаў». Праект ладзіцца другі раз. Паўгода таму ў Нацыянальным мастацкім музеі гледачы ўжо мелі магчымасць акунуцца ва ўнікальную атмасферу, створаную гучаннем цымбалаў, флейты, віяланчэлі і фартэпіяна. Кожнаму музычнаму твору адпавядае карціна, паказаная на экране ў руху. Пра дэталі праекта, што адбудзецца 7 снежня, мы пагутарылі з яго арганізатарам цымбалісткай Кацярынай Юхновай.

— У праграме вы аб'ядноўваеце музыку і жывапіс. Вонкава яны здаюцца абсалютна процілеглымі відамі мастацтва: музыка — часовы, а жывапіс — прасторавы. Чым прадыктаванае менавіта такое спалучэнне?

— Думаю, што зліццё розных відаў мастацтваў дадае ўспрыманню аб'ёмнасці. Вобразы, якія ўзнікаюць у працэсе гучання музыкі, зліваюцца з мастацкімі, што дапамагае найбольш поўна паглыбіцца ў атмасферу твора. Атрымліваецца свайго роду 3D-успрыманне. Я люблю жывапіс, таму выбрала такое спалучэнне. Прычым у канцэрце падкрэсліваю, што жывапіс — гэта не проста статычная карціна, а як і музыка: развіваецца ў часе. Мы ўспрымаем палатно не цалкам, а праз падарожжа па розных яго дэталях, тым самым самастойна выбудоўваем яго драматургію. А паглыбіцца ў атмасферу карціны дапамагае музыка.

Злучыўшы ў адным канцэрце музыку і жывапіс, мы аб'яднаем свет мастацтва. Прычым карціна не заўсёды па эпосе адпавядае музыцы, што гучыць. Тым самым я хачу падкрэсліць сувязь часоў: бывае, музычныя творы і палотны, якія адносяцца да розных эпох, аказваюцца па сэнсе вельмі блізкія адзін да аднаго. У першым аддзяленні канцэрта прагучыць старадаўняя музыка і творы сучасных беларускіх кампазітараў, стылізаваныя пад даўніну. У другім аддзяленні гледачы пачуюць музыку XIX—XXI стагоддзяў.

— У праграме прадстаўлена шмат твораў сусветнай класікі ў пералажэнні для цымбалаў. Можна заўважыць, што сёння руйнуецца стэрэатып пра цымбалы як пра выключна народны інструмент. Якое месца цымбалаў у акадэмічнай музыцы сёння?

— У мяне было некалькі сольных канцэртаў, дзе цымбалы гучалі без суправаджэння іншых інструментаў. Выканальніцкая школа развіваецца, пашыраецца рэпертуар, і цымбалы даўно перараслі выключна народнае бытаванне і сталі раўнапраўным удзельнікам акадэмічнай музычнай сцэны. Сваю задачу як выканаўца бачу ў тым, каб паказаць, што цымбалы — інструмент самадастатковы. І падкрэсліваю гэта канцэртамі. Магчыма, калі ў праграме задзейнічаны толькі адзін інструмент, адзін тэмбр, гэта складана для ўспрымання непадрыхтаванага слухача. А цяперашні канцэрт разлічаны на шырокую публіку. Таму цымбалы прагучаць у ансамблі з такімі класічнымі інструментамі, як віяланчэль і флейта. Мне здаецца, у такім ансамблі яны набліжаюцца да акадэмічнага гучання. У некаторых творах тэмбр цымбалаў павінен імітаваць гучанне клавесіна.

— Трыа цымбалаў, флейты і віяланчэлі выкарыстаў кампазітар Віктар Войцік для выканання старадаўняй музыкі. Якія выразныя магчымасці закладзены ў такім спалучэнні, на ваш погляд?

— Мне здаецца, гэта выдатнае спалучэнне. Сапраўды геніяльная прыдумка, хоць нашы думкі з Віктарам Антонавічам развіваліся паралельна. На момант, калі ў мяне нарадзілася гэтая ідэя, я не ведала, што ўжо існаваў такі ансамбль. Аказалася, што Віктар Войцік рабіў

пералажэнні старадаўняй музыкі для такога трыа, а таксама ў яго ёсць аўтарскія сачыненні. На мой погляд, шыкоўныя магчымасці гэтага ансамбля ідэальна раскрываюцца ў атмасферы замка або мастацкай галерэі. Першы канцэрт пад назвай «Зліццё вобразаў» адбыўся ў Нацыянальным мастацкім музеі паўгода таму. Мне здаецца, там была адпаведная атмасфера для ўспрымання гэтых тэмбраў.

— Сёння можна заўважыць, што канцэрты акадэмічнай музыкі праводзяцца не толькі ў канцэртных залах, але і на самых нечаканых пляцоўках: у музеях, замках, арт-прасторах, кафэ і нават у метро. Магчыма, тым самым можна далучыць да класічнай музыкі новую публіку, якая пройдзе міма канцэрта ў філармоніі. Якую ролю адыгрывае знешні асяродак для ўспрымання музыкі?

— Вядома, канцэртная пляцоўка стварае пэўную атмасферу. Мне здаецца, вельмі важна, каб музыка адпавядала памяшканню, дзе гучыць. У мяне была ідэя арганізаваць канцэрт «Зліццё вобразаў» у адным з замкаў — Мірскім або Нясвіжскім. На мой погляд, там ідэальная атмасфера для падобнай праграмы. Але на цяперашнім этапе зала філармоніі з камерцыйнага пункту гледжання больш выгадная, бо хутчэй можа сабраць публіку.

— Гледачы прыйдуць на канцэрт і ўбачаць вынік. Але ўсе мы ведаем, што за гэтым вынікам — тытанічная праца: не толькі выканальніцкая, але і арганізатарская. Ці лёгка сумяшчаць такія розныя віды працы?

— Кожны чалавек павінен займацца тым, што ўмее. Калі гэта музыкант, то — займацца падрыхтоўкай музычнага матэрыялу. Сёння ж арганізаваць канцэрт нават у філармоніі даволі складана, паколькі на плечы музыканта кладзецца ўся праца, у тым ліку рэклама, распаўсюджванне квіткоў. Альбо ты робіш усё сам, альбо гэтая падзея не адбудзецца наогул. Паколькі гэты праект мне вельмі цікавы, даводзіцца займацца яго арганізацыяй самастойна. Але пры гэтым мой псіхатып абсалютна не адпавядае ролі арганізатара.

— Такі канцэрт — падзея ўнікальная або падобныя праекты ўжо былі?

— Падобныя праекты праводзяцца. Арганізоўваюцца розныя канцэрты з відэашэрагам. У Маскве цымбалістка Кацярына Анохіна ладзіла серыю канцэртаў, дзе спалучаліся музыка, жывапіс і паэзія. У Мінску Таццяна Старчанка ладзіць у філармоніі канцэрты, дзе аб'ядноўваюцца музыка і паэзія. Таму ў сумяшчэнні розных відаў мастацтва няма маёй арыгінальнай ідэі, але ў маёй падачы гэта выглядае крыху інакш.

— У праграме канцэрта прысутнічаюць сачыненні нацыянальных аўтараў — Віктара Войціка, Віктара Капыцько, Уладзіміра Дарохіна. Наколькі цымбалы папулярныя ў беларускіх кампазітараў?

— Беларускія кампазітары зацікаўлены гэтым інструментам, у чым немалая заслуга цымбалісткі Веранікі Прадзед. Шмат арыгінальных твораў былі напісаныя адмыслова для яе. Таксама звяртаюцца да цымбалаў і як да нацыянальнага інструмента. Вядома, хацелася б больш твораў, дзе выкарыстоўваюцца новыя тэхнічныя магчымасці інструмента.

Такія цымбальныя творы Віктара Капыцько. У канцэрце прагучыць яго «Куранта» для цымбалаў-сола з «Ананімнага славянскага сшытка XVIII стагоддзя». Твор трохгалосны, запісваецца на трох лінейках, што наогул не ўласціва для цымбалаў. У канцэрце будзе шмат разнастайных твораў, якія, спадзяюся, знойдуць водгук у слухачоў.

Любоў СЫЦЬКО

...НАД МІТУСНЁЙ

Мінскі трыумф Хасэ Карэраса і Аркадзя Берына

Сусветна вядомы іспанскі оперны спявак Хасэ Карэрас выступіў у Палацы Рэспублікі. Уладальнік прэмій «Грэмі», *Classic Brit Awards*, ганаровы доктар розных універсітэтаў, акадэмій і гарачы футбольны заўзятар упершыню спяваў у суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь. За дырыжорскія пультам — маэстра Аркадзь Берын.

Беларускія аматары музыкі памятаюць канцэрты «Трох тэнараў» — Пласіда Дамінга, Лучана Паваро́ці і Хасэ Карэраса, што зрабілі ў 1990-я сапраўдны фурор. У памяці і тэлевізійныя версіі яго канцэртаў з Мансэрат Кабалье. Дарэчы, оперная кар'ера Х. Карэраса пачалася з лёгкай рукі М. Кабалье, калі яму было крыху больш за дваццаць гадоў. Яна настаяла на тым, каб Хасэ запрасілі спяваць у оперы «Лукрэцыя Борджа», дзе сама выконвала галоўную ролю. Пасля артыст спяваў у лепшых тэатрах свету, у яго рэпертуары — больш за 60 опер і 150 альбомаў.

У 1987 годзе лекары паставілі саракагадоваму артысту страшны дыягназ — вострая лейкемія. Але Карэрас перамог хваробу і вярнуўся на сцэну. У 1998 годзе ён арганізаваў фонд, які збірае грошы на даследаванні лейкеміі і аказанне дапамогі людзям з анкалагічнымі захворваннямі. З тых часоў даходы спевака ад многіх канцэртаў паступаюць у гэты фонд. Перанесеная хвароба не адбілася на яго голасе. Але з пачатку 1990-х ён стаў усё радзей выступаць у оперных спектаклях, а ў 2009 афіцыйна абвясціў аб завяршэнні опернай кар'еры. Зараз Х. Карэрас выступае з канцэртамі, выконваючы неапалітанскія і іспанскія песні, балады, рамансы, эстрадныя кампазіцыі, а таксама музыку амерыканскіх мюзіклаў.

У Мінску і была прадстаўлена такая праграма. Публіка захоплена вітала з'яўленне легендарнага спевака на сцэне. З першых жа гукаў ён захапіў увагу слухачоў і не адпускаў да канца канцэрта. Створаныя спеваком шэдэўры напоўнены самымі рознымі пачуццямі: ад мяккай лірыкі да глыбокага драматызму, а часам і трагізму. Х. Карэрас тонка адчувае спецыфіку італьянскага і іспанскага песеннага жанру, адрозную ад выканання оперных арый. Ён выдатна валодае гнуткім тэмпарытмам, пераканаўча выбудоўвае драматургію, выстаўляючы часцяком яркую кульмінацыю ў канцы песень, чым «заводзіць» слухачоў і прымушае іх выбухнуць бурнымі апладысментамі. Публіка атрымлівала асалоду ад усіх твораў, асабліва ад такіх шэдэўраў, як «Апошняя песня», «Пасіонэ», «Вярніся ў Сарэнта».

Шыкоўныя спевы Х. Карэраса суправаджаліся выдатнай ігрой аркестра, якім кіраваў майстар акампанементу Аркадзь Берын. У мінскім канцэрце Х. Карэрас, А. Берын і аркестранты як бы зліліся ў адным дыханні і ўзаемаразуменні. Адчувалася, што ўсе яны атрымліваюць задавальненне ад сутворчасці. Калі я спытала Х. Карэраса, як ён працуе з нашым аркестрам і дырыжорам, ён адказаў: «Выдатна! Я шчаслівы!»

Праграма канцэрта была выбудавана так, што паміж вакальнымі нумарамі выконваліся аркестравыя шэдэўры італьянскіх кампазітараў — Уверцюры да опер «Сіла лёсу» і «Набука» Вердзі, да оперы «Дон Паскуале» Даніцэці, «Інтэрмеца» з оперы «Манон Леско» Пучыні. Тут дырыжор і аркестр пакарылі публіку яркім выкананнем твораў, разнастайнасцю дынамікі і гукавой палітры: ад пранікнёнага *pp* да магутнага *ff*, тонкіх штрыхоў і дзівоснага вібрата ў струнных. Можна смела сказаць, што ўсе аркестранты іграліна вялікім уздыме і натхненні, а дырыжор аказваў эмацыянальнае ўздзеянне не толькі на музыкаў, але і на публіку, ствараючы ў зале асаблівую ўзнёслую атмасферу. Адзначым невялікі штрых: на сцэне іспанскім гукарэжысёрам, які прыехаў з Х. Карэрасам, сумесна з нашымі спецыялістамі ў гэтай галіне былі па-майстэрску расстаўлены мікрафоны, што, безумоўна, адбілася на якасці гучання аркестра.

Х. Карэрас сказаў, што больш за ўсё любіць спяваць. Усё астатняе, на яго думку, мітусня. Зараз яму крыху больш за семдзесят. Ён усміхнуўся і адзначыў, што будзе спяваць яшчэ гадоў трыццаць, а потым пакіне гэтую справу…

Трыумфальны канцэрт двух маэстра — тэнара Х. Карэраса і дырыжора А. Берына — стаў сапраўдным падарункам для беларускай публікі ад Міжнароднага канцэртнага холдынга «*Berin Iglesias Art*». Мы з нецярпеннем чакаем арганізаваных ім наступных канцэртаў, у тым ліку выступлення аркестра Горана Брэгавіча сумесна з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь, што адбудзецца 11 снежня ў Палацы Рэспублікі. За дырыжорскім пультам зноў будзе маэстра А. Берын, наш зямляк, які на працягу трыццаці гадоў працаваў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, у свой час заснаваў Канцэртны духавы аркестр «Няміга». Цяпер ён жыве ў Германіі, але пастаянна выступае з канцэртамі на сваёй радзіме, у Беларусі.

Элеанора СКУРАТАВА

Сілуэты Спадчыны

Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

ЗАСВІР

Мне заўсёды падабаецца, калі храм стаіць крыху наводдаль ад паселішча. Здаецца, пасля доўгай дарогі ён прыпыніўся вось тут, каб перадыхнуць ці агледзецца, куды завёў яго лёс.

Акінуў позіркам наваколле і зразумеў, што нездарма збочыў з дарогі. Пагорак, лясныя гоні, шырокая дарога. Прыгожа, зацішна… І вырашае храм стаяць тут цвёрда, непарушна зліцца з наваколлем. Сустракаць разам сонца, дождж і вецер, абвяшчаць звонам высокіх купалоў надыход новага дня і маліцца разам з тымі, хто прыйдзе пад яго скляпенні, з удзячнасцю, што атрымалі яшчэ адзін дзень жыцця. За мір на гэтай зямлі, за тое, што яна дае чалавеку і што ад яго патрабуе…

Здаецца, нешта падобнае можна назіраць у вёсцы Засвір, што ў Мядзельскім раёне. Каталіцкая святыня стаіць на ўскрайку паселішча ўжо больш як трыста гадоў. Над наваколлем пануюць яе, можа, не вельмі высокія, але суровыя вежы, ды і наогул касцёл крыху падобны на сярэднявечны замак.

Не пуставала гэтае маляўнічае месца і да будоўлі храма. З пачатку XVII і да пачатку XVIII стагоддзя тут быў драўляны касцёл. Больш звестак засталося пра кляштар, які знаходзіўся побач з касцёлам. Сродкі на яго будоўлю ахвяраваў маршалак ашмянскі Вялікага Княства Літоўскага Крыштаф Зяновіч у 1697 годзе. Дарэчы, гэты кляштарны комплекс манахаў-кармелітаў на той час быў самым вялікім на землях ВКЛ. Літаральна праз пятнаццаць гадоў на сродкі гэтага ж шляхецкага роду распачалася маштабная будоўля новага кляштарнага комплексу, але на гэты раз каменнага.

Разам з мураванымі сценамі жылых будынкаў узвялі цагляны касцёл Найсвяцейшай Троіцы ў стылі барока з дзвюма вежамі. Храм вельмі сціпла ўпрыгожаны звонку, што надае яму стрыманую ўрачыстасць і дух абарончага збудавання. Узмацняе гэтае ўражанне асаблівы ўваход у касцёл. Ён дапоўнены невысокім паўкруглым барбаканам, які ахінае, быццам абараняючы, уваход у святыню.

Што датычыцца жылога будынка кляштара, то пацярпеў ён спаўна. Некалькі сцен у руінах. Але нават па тым, што захавалася, можна ўявіць, якіх памераў ён быў. Недзе тут, пад грудамі бітай цэглы, магчыма, захаваліся сутарэнні, у якіх трымалі ўдзельнікаў паўстання 1830—1831 гадоў. Манахі дапамаглі палонным збегчы, што стала адной з прычын таго, што кляштар неўзабаве закрылі, а касцёл пераасвяцілі ў праваслаўную царкву.

Але ж будынкі былога кляштара працягвалі служыць людзям і надалей. Пасля Першай сусветнай вайны ў іх размясціўся ваенны шпіталь, пасля — вясковая школа.

Зусім побач з касцёлам на магутным каменным падмурку захавалася вежа-званіца, а насупраць святыні — сціплая цагляная брама, якая без агароджы выглядае сіратліва.

У 20-я гады мінулага стагоддзя на вежы касцёла вярнулі каталіцкія крыжы. Але ненадоўга. У 1946 годзе святыня была закрытая. На 45 гадоў. Сёння храм адрэстаўраваны, і да яго расчыненых дзвярэй зноў цячэ людская плынь.

Якімі помнікамі даўніны багатая яшчэ вёска Засвір? У першую чаргу былая шляхецкая сядзіба, якая некалі насіла назву «Алешкі». Захаваўся драўляны сядзібны дом сціплай пабудовы, некалькі гаспадарчых будынкаў і вялізная плябанія вельмі ўдалай канструкцыі, што стаіць непадалёк ад касцёла.

Дарэчы будзе згадаць адно з самых цікавых сваімі абрысамі возера Свір, якое знаходзіцца побач. Ад яго назвы, відавочна, і ўтварылася назва вёскі Засвір. Возера вузкай вадзяной стужкай працягнулася ад гарадскога пасёлка Свір амаль да возера Вішнёўскага на 14,1 кіламетра ўздоўж граніцы з Гродзенскай вобласцю. Гэта другое па даўжыні возера ў Беларусі.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк 06.12.2018 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1273

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 4641

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.